ПРОЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

Нядзеля, 16 студзеня 1938 г., № 3 (345)

Цана 20 кап.

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

Орган праўлення ССПБ і Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР

ПЕРШАЯ СЕСІЯ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР ПЕРШАГА СКЛІКАННЯ

СЕСІЯ НАРОДНАГА ПАРЛАМЕНТА

Магутным уздымам творчага энтузіязма сустрэла краіна першую сесію народнага парламента. Рабочыя і калгаснікі, інтэлігенцыя, увесь народ неабсяжнай нашай радзімы азнамяноўвае першую сесію Вярхоўнага Совета СССР новым палітычным і вытворчым уздымам.

Нідзе ў свеце, ні адзін урад не карыстаецца такім давер'ем і любоўю з боку самых шырокіх працоўных мас, як урад краіны перамогшага социялізма — Вярхоўны Совет СССР. Усюды, на ўсіх мовах раздаюцца гарачыя словы любві ў гонар стваральніка самай дэмакратычнай у свеце Канстытуцыі, у гонар кавала чалавечага шчасця, першага дэпутата народа, таварыша Сталіна.

Тысячагоддзямі марыла перадавое чалавецтва аб разняволенні народа. Колькі загінула вядомых і невядомых герояў, якія імкнуліся вызваліць народ ад прыгнёту і эксплаатацыі. Але гэта было нязбыўнай марай, пакуль рабочы клас не стварыў сваёй комуністычнай партыі, пакуль не даў свету вялікіх правадыроў прыгнечаных, геніяльных Леніна і Сталіна, пад кіраўніцтвам якіх дваццаць год назад на адной шостай часткі земнага шара — у Расіі раз і назаўсёды была скінута ўлада эксплаататараў.

Ведучы барацьбу не на жыццё, а на смерць, перш на франтах грамадзянскай вайны — з атрэп'ем старога ладу жандарскай Расіі, з інтэрвентамі чатырнаццаці дзяржаў, потым на франтах гаспадарчага і культурнага будаўніцтва — з рэшткамі эксплаататарскіх класаў, бязлітасна знішчаючы паразітычныя класы і іх прадстаўнікоў, трацкісцка-бухарынскіх, нацыянал-фашысцкіх ды іншых бандытаў — гераічны совецкі народ пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна пабудаваў соцыялізм, вядзе барацьбу за пабудову комуністычнага грамадства. І мы пераможам, бо з намі праўда, з намі — таварыш Сталін!

Натхнёныя перамогамі соцыялізма ў СССР, іспанскі і кітайскі народы вядуць гераічную барацьбу за сваё вызваленне. У рашаючым баю фашызм будзе біты. З кожным днём германскія, італьянскія і японскія драпежнікі набліжаюцца да сваёй пагібелі. Недалёка той час, калі чырвоны сцяг будзе развівацца над усім светам.

Совецкі ўрад карыстаецца гарачай любоўю не толькі нашага народа, яго любіць усё перадавое чалавецтва, якое здольна мысліць, гатова весці барацьбу за знішчэнне эксплаатацыі чалавека чалавекам.

На долю абраннікаў народа, дэпутатаў Вярхоўнага Совета СССР, выпала пачэснейшая гістарычная задача — весці нашу краіну наперад, да новых перамог, да вяршыні чалавечага шчасця — комунізма. Таму, выказваючы думы народа, вялікі правадыр прагрэсіўнага чалавецтва свету таварыш Сталін прад'явіў такія высокія патрабаванні да пасланцоў народа.

«Выбаршчыкі, народ павінны патрабаваць ад сваіх дэпутатаў, каб яны заставаліся на вышыні сваіх задач, каб яны ў сваёй рабоце не спускаліся да ўзроўню палітычных абываталяў, каб яны заставаліся на пасту палітычных дзеячоў ленінскага тыпу, каб яны былі такімі-ж яснымі і пэўнымі дзеячамі, як Ленін, каб яны былі такімі-ж бясстрашнымі ў баю і бязлітаснымі да ворагаў народа, якім быў Ленін, каб яны былі свабодны ад усякай панікі, ад усякага падабенства панікі, калі справа пачынае ўскладняцца і на гарызонце вырысоўваецца якая-небудзь небяспека, каб яны былі гэтак-жа свабодны ад усякага падабенства панікі, як быў свабодны Ленін, каб яны былі гэтак-жа мудры і непаспешлівы пры вырашэнні складаных пытанняў, дзе патрэбна ўсебаковая арыентацыя і ўсебаковы ўлік усіх плюсаў і мінусаў, якім быў Ленін, каб яны былі гэтак-жа праўдзівы і чэсны, якім быў Ленін, каб яны гэтак-жа любілі свой народ, як любіў яго Ленін».

Нашы дэпутаты — гэта лепшыя сыны і дочкі сваёй радзімы, цвет нашага грамадства, людзі адданыя сваёй краіне, комуністычнай партыі, правадыру народаў таварышу Сталіну.

Дэпутат — слуга народа. Давер'ем народа трэба даражыць. «Кіраўнікі прыходзяць і ўходзяць, а народ застаецца. Толькі народ бессмяротны. Усё астатняе праходзячае. Таму трэба ўмець даражыць давер'ем народа». (Сталін).

Ц. О. нашай партыі, газета «Праўда», фармулюючы наказ, дадзены дэпутатам Вярхоўнага Совета СССР на безлічных сходах і мітынгах працоўных, піша:

«— Будзьце палітычнымі дзеячамі ленінска-сталінскага тыпу. Будзьце чэснымі і праўдзівымі перад народам. Будзьце аддалымі да канца нашай вялікай радзіме, бессмяротнай справе комунізма. Будзьце бясстрашнымі ў баю і бязлітаснымі да ворагаў народа. Граміце без астатку трацкісцка-бухарынскіх гадаў — подлых фашысцкіх шпіёнаў, дыверсантаў і шкоднікаў. Змагайцеся за рост нашай соцыялістычнай прамысловасці і сельскай гаспадаркі. Мацуйце абарону нашай радзімы, каб кожны вораг, пасмеўшы пасягнуць на яе граніцы, быў змецены з твару зямлі».

Гэты наказ — свяшчэнны абавязак кожнага дэпутата Вярхоўнага Совета СССР.

Сярод другіх абраннікаў народа знаходзяцца і совецкія пісьменнікі: А. Талстой, М. Шолахаў, В. Стаўскі, А. Карнейчук, Ш. Дадзіані, П. Ойюнскі, М. Ібрагімаў. Літаратура народаў СССР ганарыцца тым, што і яе прадстаўнікі, аддалейшыя сыны свайго народа, разам з другімі дэпутатамі будуць удзельнічаць у кіраванні нашай вялікай соцыялістычнай дзяржавай. Гэта абавязвае літаратараў яшчэ шчыльней згуртавацца вакол сваёй комуністычнай партыі і свайго ўрада, яшчэ лепш працаваць, ствараючы соцыялістычную літаратуру, вартую гераічнага народа, вялікай сталінскай эпохі.

Раней бяспраўныя акторы і другія працаўнікі мастацтва цяпер нароўні з лепшымі дзяржаўнымі дзеячамі абраны ў Вярхоўны Совет СССР. Сярод іх Е. Карчагіна-Александроўская, І. Масквін, А. Хорава, К. Алабян і шмат другіх, якія давялі сваю адданасць народу, ствараючы новае соцыялістычнае мастацтва.

Працаўнікі літаратуры і мастацтва павінны яшчэ больш і лепш працаваць, каб паказаць усю веліч нашай гераічнай будоўлі, ствараючы тыпы бясстрашных барацьбітоў за справу Леніна—Сталіна, за соцыялізм.

Няхай жыве Вярхоўны Совет СССР — самы дэмакратычны ўрад у свеце!

Няхай жыве першы дэпутат народа таварыш Сталін!

ПІСЬМЕННІКІ БССР—ВЯРХОЎНАМУ СОВЕТУ СССР

Агульны сход пісьменнікаў і супрацоўнікаў праўлення ССП БССР з вялікай гордасцю зітае Вярхоўны Совет СССР, які сабраўся на сваю першую гістарычную сесію для вырашэння важнейшых дзяржаўных спраў.

Народы СССР паслалі ў Вярхоўны Совет гордасць нашай радзімы—сваіх лепшых сыноў і дачок. Склад Вярхоўнага Совета ярчэйшым чынам паказвае, як багаты дзяржаўнымі розумамі, рознастайнымі талентамі народныя масы нашай радзімы, узнятыя Вялікай соцыялістычнай рэвалюцыяй да будаўнічай творчай дзейнасці.

Вярхоўны Совет абкружан зелізарнай любоўю і ўвагай усяго шматмільённага совецкага народа, які даў наказ дэпутатам — быць дзеячамі ленінска-сталінскага тыпу, аддалымі да канца нашай радзіме і бязлітаснымі да ворагаў народа.

Пачатак работ Вярхоўнага Совета шчаслівы совецкі народ сустракае велізарнымі перамогамі на ўсіх франтах будаўніцтва соцыялізма, за ўсіх галінах свайй гіганцкай дзейнасці.

Сесія небывалага ў гісторыі свету народнага парламента, якім кіруе наймудрэйшы чалавек эпохі, вялікі Сталін, натхняе нас, совецкіх літаратараў, на інтэнсіўную творчую работу, поўніць нашы сэрцы энтузіязмам і імкненнем дасягнуць вышынямі літаратурнага майстэрства, мабілізуе на стварэнне светлых і бадзёрых песень аб нашай сонечнай краіне і яе выдатных людзях.

Прывітанне першай сесіі соцыялістычнага парламента!

Няхай жыве комуністычная партыя і вялікі правадыр народаў родны, любімы Сталін!

Прынята на агульным сходзе совецкіх пісьменнікаў у Менску 13 студзеня 1938 года.

Выдатны дакументальны фільм

11 снежня 1937 года. Памятны вечар — канун дня, які ўвайшоў у гісторыю знамянальнай датай, канун усенароднага свята — дня выбараў у Вярхоўны Совет СССР.

Вялікі тэатр. Партэр, ложы, верхнія ярусы запоўнены народам — радасным, шчаслівым, лікуючым.

Зала ўскіпела, як мора ў час прыбою. Апладысменты — гарачыя, сардэчныя, звонкія.

Воклічы — натхнёныя, палкія, хвалюючыя: «Ура Сталіну», «Няхай жыве Сталін».

Таварыш Сталін — вялікі правадыр і [illegible] народаў узышоў на трыбуну.

Сіла авацый расла і расла. Выбаршчыкі Сталінскай выбарчай акругі горада Масквы віталі свайго кандыдата ў дэпутаты Вярхоўнага Совета,—кандыдата ўсяго народа — любімага Сталіна.

Сціхла авацыя. У цішыні — спакойны голас. І кожнае слова простай і мудрай прамовы даходзіць да сэрца.

Не раз прамова перарываецца бурнымі апладысментамі, натхнёнымі авацыямі.

За сталом прэзідыума—верныя вучні і саратнікі вялікага Сталіна, кіраўнікі партыі і ўрада.

У цішыні — спакойны голас:

— ...абавязак і права выбаршчыкаў заключаюцца ў тым, каб яны ўвесь час трымалі пад кантролем сваіх дэпутатаў і каб яны ўнушалі ім—ні ў якім разе не спускацца да ўзроўню палітычных абываталяў, каб яны выбаршчыкі ўнушалі сваім дэпутатам—быць такімі, якім быў вялікі Ленін.

І простыя словы прамовы хвалююць сэрцы, натхняюць людзей.

Правадыр скончыў прамову. І з новай сілай расце авацыя. Апладыруюць выбаршчыкі Сталінскай акругі Масквы. Гэта—на экране. Апладыруюць працоўныя беларускай сталіцы. Гэта—ў зале кінотэатра.

Выдатны дакументальны фільм дэманструецца на нашым экране—заснятая і запісаная на кіноленту прамова таварыша Сталіна на прадвыбарчым сходзе выбаршчыкаў Сталінскай выбарчай акругі горада Масквы 11 снежня 1937 года ў Вялікім тэатры.

Ю. Р.



Першая сесія Совета Саюза Вярхоўнага Совета СССР. НА ЗДЫМКУ: дэпутаты Совета Саюза Вярхоўнага Совета СССР таварышы І. В. СТАЛІН, К. Е. ВАРАШЫЛАЎ, А. А. АНДРЭЕЎ і А. А. ЖДАНАЎ на першым пасяджэнні сесіі Совета Саюза. (СФ).

ПЕРШАЕ ПАСЯДЖЭННЕ СОВЕТА САЮЗА

12 студзеня ў 4 гадзіны дня ў Крамлі адкрылася сесія Совета Саюза. Па прапанове дэпутата т. **Хрушчова** Н. С. сесію адкрыў старэйшы дэпутат Совета Саюза акадэмік А. Н. **Бах.**

Пасля прамовы тав. Баха адбыліся выбары старшыні і намеснікаў старшыні Совета Саюза. Старшынёй Совета Саюза аднагалосна выбран тав. **Андрэеў** Андрэй Андрэевіч; намеснікамі старшыні выбраны тав. **Лысенка** Трафім Дзянісавіч і тав. **Сегізбаеў** Султан.

Па прапанове дэпутата тав. **Жданава** А. А. ад групы дэпутатаў Ленінграда Масквы, Кіева і Тбілісі прыняты наступны парадак дня:

1) Выбары мандатнай камісіі Совета Саюза; 2) Аб пастаянных камісіях Совета Саюза; 3) Унясенне змен і дадаткаў у некаторыя артыкулы Канстытуцыі СССР у сувязі з прынятымі рашэннямі ЦВК і СНК СССР; 4) Выбранне Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР: а) старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР, б) намеснікаў старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР, в) сакратара Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР, г) членаў Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР; 5) Стварэнне Ўрада СССР — Совета Народных Камісараў СССР; 6) Назначэнне пракурора СССР і 7) Аб аплаце выдаткаў дэпутатаў, звязаных з выкананнем іх дэпутацкіх абавязкаў.

Советам Саюза прынята пастанова разглядзець на сумесным пасяджэнні Совета Саюза і Совета Нацыянальнасцей наступныя пункты: 3) Унясенне змен і дадаткаў у некаторыя артыкулы Канстытуцыі СССР у сувязі з прынятымі рашэннямі ЦВК і СНК СССР; 4) Выбранне Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР; 5) Стварэнне Ўрада СССР — Совета Народных Камісараў СССР; 6) Назначэнне пракурора СССР; 7) Аб аплаце выдаткаў дэпутатаў, звязаных з выкананнем іх дэпутацкіх абавязкаў.

Для праверкі поўнамоцтваў дэпутатаў Совета Саюза выбрана Мандатная камісія.

ДРУГОЕ ПАСЯДЖЭННЕ СОВЕТА САЮЗА

13 студзеня адбылося другое пасяджэнне Совета Саюза. Старшынстваваў старшыня Совета Саюза дэпутат А. А. **Андрэеў.**

На гэтым пасяджэнні Советам Саюза зацверджан склад пастаянных камісій Совета Саюза. Выбрана Камісія Законадаўчых меркаванняў у складзе 10 чалавек. Старшыня Камісіі — **Еўтушэнка** Дзімітрый Мацвеевіч, дэпутат ад Беладаркоўскай акругі Кіеўскай вобласці. Бюджэтная Камісія Совета Саюза выбрана ў складзе 13 чалавек. Старшыня Камісіі— **Сідараў** Іван Іванавіч, дэпутат ад Октябрскай акругі гор. Масквы. Камісія па замежных справах Совета Саюза выбрана ў складзе 11 чалавек. Старшыня Камісіі — **Жданаў** Андрэй Аляксандравіч, дэпутат ад Валадарскай акругі гор. Ленінграда.

Советам Саюза прынята, унесеная дэпутатам П. Г. Маскатавым, прапанова аб перанясенні пункта 7 парадку дня сесіі Совета Саюза — аб аплаце выдаткаў дэпутатаў, звязаных з выкананнем іх дэпутацкіх абавязкаў — на разгляд сумеснага пасяджэння Совета Саюза і Совета Нацыянальнасцей.

14 студзеня у парадку дня сесіі Совета Саюза — даклад Мандатнай камісіі Совета Саюза.

ТРЭЦЯЕ ПАСЯДЖЭННЕ СОВЕТА САЮЗА

14 студзеня адбылося трэцяе пасяджэнне Совета Саюза. Старшынстваваў старшыня Совета Саюза дэпутат **А. А. Андрэеў.**

Совет Саюза заслухаў даклад старшыні Мандатнай камісіі Совета Саюза дэпутата **А. С. Шчэрбакова** аб праверцы поўнамоцтваў дэпутатаў Совета Саюза. Тав. Шчэрбакоў агалашае пастанову Мандатнай камісіі Совета Саюза, у якой указваецца:

1) Выбары дэпутатаў у Совет Саюза па ўсіх 569 выбарчых акругах праведзены на падставе і ў поўнай адпаведнасці з Канстытуцыяй СССР і Палажэннем аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР.

2) Ніякіх падстаў для касавання выбараў па якой-небудзь выбарчай акрузе, а таксама ніякіх скарг і заяў па выбарах дэпутатаў Совета Саюза на парушэнні Канстытуцыі і Палажэння аб выбарах як па выбарчых акругах, так і ў Цэнтральнай Выбарчай Камісіі няма.

На падставе гэтага Мандатная камісія Совета Саюза прызнае правільнасць поўнамоцтваў усіх дэпутатаў Совета Саюза, зарэгістраваных у Цэнтральнай Выбарчай Камісіі.

Па прапанове дэпутата акадэміка **А. А. Байкова** Совет Саюза прымае наступную пастанову:

«Заслухаўшы даклад Мандатнай камісіі, Совет Саюза пастанаўляе:

1) Зацвердзіць даклад Мандатнай камісіі аб прызнанні правільнымі поўнамоцтваў дэпутатаў Совета Саюза, выбраных па ўсіх 569 выбарчых акругах і зарэгістраваных Цэнтральнай Выбарчай Камісіяй па выбарах у Вярхоўны Совет СССР.

2) Лічыць работу Цэнтральнай Выбарчай Камісіі па выбарах у Вярхоўны Совет СССР закончанай».

На гэтым трэцяе пасяджэнне Совета Саюза закрываецца.

ПАСЯДЖЭННЕ СОВЕТА НАЦЫЯНАЛЬНАСЦЕЙ

12 студзеня ў 8 гадзін вечара ў Крамлі адкрылася сесія Совета Нацыянальнасцей. Па прапанове дэпутата тав. **Петроўскага** Г. І. сесію адкрыў старэйшы дэпутат Совета Нацыянальнасцей тав. **Цхакая** М. Г.

Пасля кароткай прамовы тав. Цхакая Совет Нацыянальнасцей выбраў старшыню і намеснікаў старшыні Совета Нацыянальнасцей. Старшынёй Совета Нацыянальнасцей аднагалосна выбран тав. **Шверні**к Н. М. Намеснікамі старшыні выбраны тт. **Асланава** Ч. А. і **Лявіцкі** А. М.

Советам Нацыянальнасцей зацверджан парадак дня сесіі. Для праверкі поўнамоцтваў дэпутатаў Совета Нацыянальнасцей выбрана Мандатная камісія.

Советам Нацыянальнасцей разгледжана пытанне аб пастаянных камісіях Совета Нацыянальнасцей.

Советам Нацыянальнасцей выбрана Камісія Законадаўчых меркаванняў у складзе 10 чалавек. Старшыня камісіі — тав. **Тюркін** Пётр Андрэевіч, дэпутат ад Ленінградскай сельскай акругі. Бюджэтная Камісія Совета Нацыянальнасцей выбрана ў складзе 13 чалавек. Старшыня Камісіі — **Хахлоў** Іван Сяргеевіч, дэпутат ад Маскоўскай сельскай акругі, РСФСР. Камісія па замежных справах Совета Нацыянальнасцей выбрана у складзе 10 чалавек. Старшыня Камісіі — **Булганін** Нікалай Аляксандравіч.

14 студзеня ў парадку дня сесіі Совета Нацыянальнасцей — даклад Мандатнай камісіі Совета Нацыянальнасцей.

Прамова дэпутата А. Н. БАХА пры адкрыцці сесіі Совета Саюза

Таварышы, воляю 90 мільёнаў выбаршчыкаў нашай краіны на нас ускладзен ганаровы і адказны абавязак адкрыць і правесці першую сесію Вярхоўнага Совета Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік у поўнай адпаведнасці з вялікай Сталінскай Канстытуцыяй. **(Шумныя апладысменты).**

Сталінская Канстытуцыя знамянуе новую вялікую эру ў гісторыі чалавецтва, эру соцыялістычнага грамадства, заснаванага на калектыўным уладанні і карыстанні прыладамі і сродкамі вытворчасці.

Сусветна-гістарычнае значэнне Сталінскай Канстытуцыі заключаецца ў тым, што яна ў законадаўчым парадку афармліла і асвяціла тыя глыбокія, карэнныя змены, якія адбыліся ў нашай краіне пасля Кастрычніцкай соцыялістычнай рэвалюцыі.

Сталінская Канстытуцыя не толькі самая дэмакратычная з канстытуцый, але і адзіная ў свеце сапраўды-дэмакратычная канстытуцыя. Чаму? Таму, што дэмакратыя, правы чалавека і грамадзяніна вызначаюцца не тым, што напісана ў канстытуцыях, а вытворчымі адносінамі. Там дзе пануе прыватная ўласнасць на сродкі вытворчасці, там непазбежна адбываецца эксплаатацыя чалавека чалавекам, там няма і не можа быць сапраўднай дэмакратыі, няма і не можа быць свабоды.

У нашай краіне Кастрычніцкая соцыялістычная рэвалюцыя беспаваротна скасавала прыватную ўласнасць на сродкі вытворчасці і назаўсёды знішчыла магчымасць эксплаатацыі чалавека чалавекам.

Гэтым вызначаюцца адносіны нашых працоўных мас да соцыялістычнага будаўніцтва, якое ажыццяўляецца імі пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна, і да Сталінскай Канстытуцыі, якая з'яўляецца законадаўчым афармленнем перамог соцыялізма.

Па колькасці выбаршчыкаў, прымаўшых удзел у выбарах, па колькасці галасоў, пададзеных за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных, выбары 12 снежня не маюць сабе роўных ні ў якой іншай краіне. Выбары прайшлі паўсямесна ў святочнай атмасферы, у настроі радаснага выканання важнейшага грамадзянскага абавязку. Рэзультаты выбараў 12 снежня паказалі, што насельніцтва нашага Саюза складаецца не з разрозненых груп, праследуючых кожная свае асобныя інтарэсы, а з адзінага, шчыльна згуртаванага вялікага калектыва, свядома ідучага пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна па шляху пабудовы бяскласавага грамадства, пабудовы новага, справядлівага і шчаслівага жыцця. **(Шумныя працяглыя апладысменты).**

Таварышы, 20 год, прайшоўшых з часу Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі, прывялі нас да таго, што мы не толькі пабудавалі моцны фундамент будынка соцыялістычнага грамадства, але і падвялі ўвесь будынак пад дах. Аб гэтым, сведчаць усе ажыццёўленыя намі, агульнапрызнаныя дасягненні ў розных галінах палітычнай, эканамічнай і культурнай дзейнасці.

Але нам прадстаіць яшчэ багата складанай і цяжкой работы па ўдасканаленню і аздаблы гэтага будынка. У Вярхоўным Совеце Саюза ССР пытанні далейшага соцыялістычнага будаўніцтва будуць адыгрываць самую актуальную ролю.

З гэтых пытанняў першачарговымі трэба лічыць рацыянальнае скарыстанне стаханаўскай прадукцыйнасці працы шляхам адпаведнага ўдасканалення тэхнічных працэсаў.

У адной з сваіх работ В. І. Ленін адзначыў, што падобна таму, як капіталізм перамог феадалізм велізарным павелічэннем прадукцыйнасці фабрычна-заводскай працы, так і соцыялізм пераможа капіталізм велізарным павелічэннем прадукцыйнасці калектыўнай соцыялістычнай працы ў параўнанні з прадукцыйнасцю працы ў капіталістычным грамадстве.

Стаханаўскі рух, які ахапіў масы працоўных у розных галінах народнай гаспадаркі і ўзрос на глебе нашага соцыялістычнага будаўніцтва, бліскуча пацвердзіў прадбачанне вялікага настаўніка.

Удасканаленне тэхнічных працэсаў у адпаведнасці са стаханаўскай прадукцыйнасцю працы адкрывае шырокія гарызонты нашай прамысловасці і ўсёй народнай гаспадаркі. У капіталістычных краінах моцнае павышэнне прадукцыйнай магутнасці прадпрыемстваў, заснаванае на павелічэнні прадукцыйнасці працы, немінуча прывяло-б да перавытворчасці і эканамічнага крызісу. У нас-жа яно прыводзіць толькі да скарачэння рабочага дня, які ў СССР ужо і цяпер меншы, чым у якой-небудзь іншай краіне. А скарачэнне рабочага дня дае магчымасць працоўным прысвяціць больш часу культурнай дзейнасці, узняць свой культурны ўзровень, г. зн. спрыяе беспарапыннаму згладжванню розніцы паміж працай фізічнай і працай разумовай.

Паралельна з ростам вытворчасці мы павінны будзем прысвяціць шмат увагі далейшаму разгортванню работ па культурна-бытавому абслугоўванню працоўных мас.

Таварышы, поспехі нашы вялікія. Але мы не забываем і аб ворагах, аб капіталістычным абкружэнні. Ворагі бачаць у нашых поспехах смяротную небяспеку для абараняемага імі капіталістычнага ладу. І калі мы ў апошнія годы не падвергнуліся нападу, то толькі таму, што выдатнейшае становішча нашай Чырвонай Арміі выклікае ў іх боязнь, што калі яны нападуць на нас, — ім не здабраваць. **(Бурныя, працяглыя апладысменты).**

Таварышы, і сапраўды наша Чырвоная Армія — адна з лепшых па сваёй ваеннай падрыхтоўцы і па ўсяму ўзбраенню. У той-жа час яна несумненна і безумоўна лепшая па сваёй адданасці радзіме.

У капіталістычных краінах арміі камплектуюцца з працоўных, якія з'яўляюцца класавымі ворагамі капіталістычнага ладу. І дысцыпліна ў гэтых арміях падтрымліваецца толькі шляхам суровых пакаранняў.

Наша Чырвоная Армія — плоць ад плоці працоўных мас — горача і беззаветна аддана агульнай справе будаўніцтва новага, шчаслівага жыцця народа.

Мы ўсямерна імкнемся да міру не толькі таму, што нам агідна і ненавісна бойня ні ў чым не вінаватых людзей, але і таму, што вайна затрымала-б наша соцыялістычнае будаўніцтва. Мы хочам міру, але калі на нас нападуць, мы ўсе, як адзін чалавек, станем на абарону нашай соцыялістычнай радзімы, і тады гора будзе нашым ворагам. **(Бурныя, працяглыя апладысменты. Усе ўстаюць. Воклічы: «Няхай жыве наша Чырвоная Армія!» Крыкі «ура»!).**

Таварышы, гісторыя дваццацігоддзя, прайшоўшага з часу Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі, гісторыя грандыёзных поспехаў, здабытых пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі, напружаннем сіл і энергіі совецкіх працоўных мас, будзе прадметам стараннага вывучэння ў будучыя вякі, а для нашых сучаснікаў яна служыць яркім прыкладам таго, чаго могуць дасягнуць працоўныя масы пры ясным разуменні сваіх класавых інтарэсаў і непахіснай волі да барацьбы за іх ажыццяўленне.

Таварышы, няхай жывуць працоўныя нашай краіны, стварыўшыя першую ў свеце вялікую соцыялістычную дзяржаву пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна! **(Прысутныя ў зале ўстаюць, бурна апладыруюць).**

Няхай жыве Усесаюзная комуністычная партыя **(бурныя апладысменты)**, авангард працоўных, разам з імі вынесшая на сваіх плячах увесь цяжар нашага вялікага будаўніцтва. **(Бурныя апладысменты).**

Таварышы, абвяшчаю першую сесію Совета Саюза адкрытай. **(Прысутныя ў зале ўстаюць, бурна апладыруюць. Апладысменты пераходзяць у авацыю).**

Воклічы з месц: «Няхай жыве таварыш Сталін, ура!» **(Бурныя апладысменты, пераходзячыя ў авацыю, воклічы «ура!»).**

Першая сесія Вярхоўнага Совета СССР першага склікання

ПРАМОВА ДЭПУТАТА А. А. ЖДАНАВА

Таварышы, група дэпутатаў Масквы, Ленінграда, Кіева і Тбілісі даручыла мне ўнесці на абмеркаванне першай сесіі Совета Саюза прапанову аб уключэнні ў парадак дня першай сесіі Совета Саюза наступных пытанняў:

Першае пытанне—выбары Мандатнай камісіі Совета Саюза.

Матывы для пастаноўкі гэтага пытання вынікаюць з артыкула 50 Канстытуцыі, згодна якой Совет Саюза і Совет Нацыянальнасцей выбіраюць Мандатныя камісіі, якія правяраюць поўнамоцтвы дэпутатаў кожнай палаты.

Другое пытанне—аб выбранні пастаянных камісій Совета Саюза.

Мэтазгоднасць пастаноўкі гэтага пытання дыктуецца неабходнасцю падрыхтоўкі для пасяджэнняў сесіі Совета Саюза пытанняў, якія адносяцца да кампетэнцыі Совета Саюза: падрыхтоўка законаў, бюджэта і г. д.

Па ўсіх гэтых пытаннях, відаць, мэтазгодна арганізаваць пастаянныя камісіі Совета Саюза.

Трэцяе пытанне парадку дня—унясенне змен і дадаткаў у некаторыя артыкулы Канстытуцыі Саюза ССР, у сувязі з прынятымі рашэннямі ЦВК і СНК СССР.

Вядома, што з часу прыняцця Канстытуцыі прайшло больш года. За гэты час, у сувязі з патрэбнасцямі кіравання дзяржавай, ЦВК і СНК СССР унеслі рад змен у некаторыя артыкулы Канстытуцыі СССР, змен, звязаных з арганізацыяй новых абласцей у складзе саюзных рэспублік, з арганізацыяй новых народных камісарыятаў і г. д.

Група дэпутатаў, якая даручыла мне паведаміць меркаванні па парадку дня, лічыць мэтазгодным, каб пытанне аб змяненні і дапаўненні некаторых артыкулаў Канстытуцыі, прынятых да сесіі Совета Саюза, было-б абмеркавана ў Совеце Саюза.

Чацвертае пытанне, якое мы прапануем уключыць у парадак дня—выбранне Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР.

Пятае пытанне—стварэнне ўрада СССР—Совета Народных Камісараў СССР.

Шостае пытанне—назначэнне пракурора Саюза ССР.

Сёмае пытанне—аб аплаце выдаткаў дэпутатаў, звязаных з выкананнем іх дэпутацкіх абавязкаў.

Вось той круг пытанняў, якія група дэпутатаў лічыла-б мэтазгодным унесці на разгляд і абмеркаванне сесіі Совета Саюза.

Што датычыць парадку абмеркавання, то, згодна артыкула 48 Канстытуцыі Саюза, Прэзідыум Вярхоўнага Совета выбіраецца на сумесным пасяджэнні абодвух палат. Згодна артыкула 56 Канстытуцыі Ўрад Саюза ССР утвараецца таксама на сумесным пасяджэнні абодвух палат Вярхоўнага Совета.

У сувязі з гэтым нам здаецца мэтазгодным, каб Совет Саюза праявіў ініцыятыву ў тым, каб пытанні аб фармаванні ўрада СССР і аб выбранні Прэзідыума Совета былі абмеркаваны на першай сесіі Вярхоўнага Совета.

Я думаю, што Совет Саюза палічыць мэтазгодным гэтыя пытанні абмеркаваць цяпер-жа на сумесных пасяджэннях абодвух палат і даручыць старшыні нашай палаты згаварыцца з старшынёй Совета Нацыянальнасцей аб наладжанні сумеснага пасяджэння абодвух палат для абмеркавання пытанняў аб выбранні Прэзідыума Вярхоўнага Совета і стварэнні ўрада Саюза.

Што датычыць парадку абмеркавання пытання аб зменах і дадатках да некаторых артыкулаў Канстытуцыі і пытання аб пракурору Саюза ССР, то тая-ж група дэпутатаў даручыла мне далажыць Совету Саюза аб тым, што, відаць, мэтазгодна, каб і гэтыя пытанні таксама былі абмеркаваны на сумесным пасяджэнні абодвух палат.

Вось тыя прапановы, якія я маю далажыць па даручэнню групы дэпутатаў.



Дэпутаты ад беларускага народа ў Вярхоўны Совет СССР. НА ЗДЫМКУ (злева направа): у першым радзе — М. Т. Фінагенаў і Е. І. Гарачоў; у другім радзе — С. П. Астапаў і Г. Ф. Альтшулер. (Здымак зроблен перад ад'ездам на першую сесію Вярхоўнага Совета). Фото Б. Вернер (БСФ).

ПРАМОВА ДЭПУТАТА О. Ю. ШМІДТА

Таварышы дэпутаты Совета Нацыянальнасцей, ад імя групы дэпутатаў Далёка-Ўсходняга края, Украіны і Татарскай аўтаномнай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі ўношу прапанову — арганізаваць пастаянную Камісію па замежных справах. Такая камісія, па-першае, зусім адпавядае нашай Канстытуцыі і, па-другое, вызначаецца сутнасцю справы і перажываемым намі момантам.

У артыкуле 14 нашай Канстытуцыі ўказана, якія функцыі выдзелены ў кампетэнцыю СССР, Саюза ў цэлым, у асобе яго вышэйшых органаў. У тым ліку ў артыкуле 14 указана:

а) Прадстаўніцтва Саюза ў міжнародных адносінах, заключэнне і ратыфікацыя дагавораў з іншымі дзяржавамі;

б) Пытанні вайны і міру;

в) Прыняцце ў склад СССР новых рэспублік.

Такім чынам, замежныя справы ўваходзяць у кампетэнцыю вышэйшага органа — Вярхоўнага Совета, у тым ліку нашай палаты Совета Нацыянальнасцей.

Ці патрэбна нам Камісія па замежных справах? Наша мірная палітыка ёсць найвялікшы гістарычны фактар не толькі для нашай краіны, але для свету ў цэлым. Мірная палітыка Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік вынікае з самой сутнасці нашай краіны, з яе соцыялістычнай прыроды, прынцыпова чуждай усякім заваявальным тэндэнцыям і заснаванай на павазе правоў усіх як вялікіх, так і малых народаў.

Мірная палітыка СССР грунтуецца таксама на тых велізарных дасягненнях, з якімі наша радзіма прышла да 20-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэвалюцыі, да склікання першай сесіі Вярхоўнага Совета, на аснове самай дэмакратычнай у свеце Сталінскай Канстытуцыі. **(Бурныя апладысменты).**

Мы прышлі сюды дэпутатамі народа ў выніку каласальных перамог, дасягнутых працоўнымі нашай краіны пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі, пад кіраўніцтвам нашага правадыра, правадыра ўсяго прагрэсіўнага чалавецтва таварыша Сталіна. **(Бурныя апладысменты, якія пераходзяць у авацыю. Уся зала ўстае. Крыкі «ура!»).**

Гэтыя дасягненні зрабілі нашу краіну першакласнай індустрыяльнай дзяржавай. Пад кіраўніцтвам таварыша Сталіна і яго вернага саратніка маршала Совецкага Саюза таварыша Варашылава **(бурныя, працяглыя апладысменты. Уся зала ўстае. Воклічы: «Няхай жыве таварыш Сталін!», «Няхай жыве таварыш Варашылаў!», «Ура!»)** у нас створана першакласная Чырвоная Армія **(бурныя апладысменты)**, якая здольна абараніць нашу радзіму ад усякіх замахаў і забяспечыць яе мірную палітыку. **(Бурныя апладысменты).**

А замахі на мір мэгчымы. Больш таго, мір за апошнія гады парушан ужо ў трох краінах свету — у Афрыцы, Азіі і Еўропе. Зямны шар перажывае ўжо становішча вайны.

Ці можам мы аб гэтым забываць? Ці можам мы сярод нашага мірнага будаўніцтва забываць аб капіталістычным акружэнні, засылаючым нам сюды шпіёнаў, дыверсантаў, аб тым акружэнні, агентура якога так бліскуча і паслядоўна разгромлена нашымі вернымі работнікамі НКВД, сталінскім наркомам тав. Ежовым. **(Бурныя, працяглыя апладысменты. Уся зала ўстае. Вокліч: «Любімаму наркому Нікалаю Івანавічу Ежову ура!». Бурныя апладысменты).**

Ці можам мы забываць аб гэтым акружэнні, якое глядзіць з зайздрасцю на нашы перамогі і дасягненні, у трывозе за ўласны лёс.

Ці можам мы не бачыць, як у міжнароднай абстаноўцы нарастаюць трывожныя з'явішчы, як прынцыпы міру то і справа церпяць страты. На нашых вачах некаторыя дзяржавы адкрыта парушаюць міжнародныя дагаворы. Стараюцца выхаласціць Лігу нацый. Адначасова робяцца спробы да стварэння новых саюзаў з яўна агрэсіўнымі мэтамі.

У гэтай грознай абстаноўцы, нагадваючай атмасферу перадалня сусветнай імперыялістычнай вайны 1914—18 год, наш Совецкі Саюз высіцца як аплот міру ва ўсім свеце, як надзея чалавецтва. **(Бурныя апладысменты).** У гэтай абстаноўцы вярхоўны орган СССР не можа не звярнуць самую пільную ўвагу на міжнародныя справы. Гэта ўвага раздзяляецца ўсёй нашай краінай. Усё насельніцтва 170-мільённай краіны аднадушна падтрымлівае свой урад у яго ўнутранай і міжнароднай палітыцы. **(Бурныя апладысменты).**

Краіна падтрымлівае свой урад у яго рашучасці абараняць нашае мірнае будаўніцтва усёй нашай магутнасцю.

Наша краіна дасягнула ніколі нябачанага ў свеце маральнага і палітычнага адзінства, сказаў старшыня Совета Народных Камісараў тав. Молатаў. **(Бурныя апладысменты. Воклічы: «Няхай жыве глава ўрада Совецкага Саюза тав. Молатаў!». Бурныя апладысменты).**

Краіна аднадушна падтрымлівае мірную ўнешнюю палітыку, праваджаемую так таленавіта па ўказанню партыі і ўрада верным сталінцам, выпрабаваным членам партыі наркомам замежных спраў тав. Літвінавым. **(Бурныя апладысменты).**

Шматлікія нацыянальнасці, складаючыя наш вялікі совецкі народ, зацікаўлены ў міры, будуць яго падтрымліваць, і змогуць адстаяць яго ад замахаў. Хіба мы аддадзім нашы перамогі? Ніколі! **(Бурныя апладысменты).**

З прычыны важнасці пытанняў замежнай палітыкі, уношу прапанову ад імя спамянутай групы дэпутатаў аб стварэнні Советам Нацыянальнасцей сваёй пастаяннай Камісіі па замежных справах. **(Бурныя апладысменты).**

Прамова дэпутата М. Г. ЦХАКАЯ

пры адкрыцці сесіі Совета Нацыянальнасцей

Дарагія таварышы дэпутаты Совета Нацыянальнасцей Вярхоўнага Совета СССР! Дазвольце мне перад адкрыццём нашай першай сесіі кінуць кароценькі позірк на гісторыю выбараў. Сёнешні ўрачысты дзень, — вялікае, сапраўды ўсенароднае свята—дзень адкрыцця сесіі Вярхоўнага Совета, выбранага на аснове Сталінскай соцыялістычнай Канстытуцыі, самай сваводнай і самай дэмакратычнай у свеце. **(Апладысменты, крыкі «ура!»).**

На самой справе, таварышы, якая гісторыя выбараў? Якія рэзультаты перамогі блока комуністаў і беспартыйных на выбарах? Напрыклад: па Маскве ў выбарах прымала ўдзел 99,13 процанта выбаршчыкаў, па Ленінграду — 96,3 процанта, па Менску — 99.6 процанта, Баку — 95,5 процанта, па Тбілісі — 95,6 процанта.

Небывалыя ў свеце, нават у самых дэмакратычных краінах рэзультаты! Адкуль усё гэта? Адтуль, дарагія таварышы, што ў нашай шматнацыянальнай дзяржаве дыктатуры рабочага класа, у вялікай дзяржаве рабочых і сялян соцыялізм ужо ажыццёўлен, ён увайшоў у быт, у штодзённае жыццё народаў.

Братэрства, адзінства нашых совецкіх народаў і іх згуртаванасць вакол вялікай партыі Леніна — Сталіна робяць нашу радзіму непераможнай. Мы ідзем, як гаворыцца, сямімільнымі крокамі прама і нястрымана да поўнага комунізма ў СССР у цэлым, ва ўсіх яго адзінацаці саюзных рэспубліках і ўваходзячых у іх аўтаномных частках.

Усе плямёны, нацыі, народы СССР ахоплены вялікім энтузіязмам, вялікім соцыялістычным спаборніцтвам — гэтым комуністычным метадам самай прадукцыйнай соцыялістычнай працы, ахоплены будаўніцтвам соцыялізма, будаўніцтвам вялікай культуры, умацаваннем комуністычнага братэрства народаў.

Мы ствараем, таварышы, новае жыццё, новую цывілізацыю, новую культуру, нацыянальную па форме, соцыялістычную па зместу.

Самыя адсталыя і цёмныя пры царскім рэжыме нацыянальнасці цяпер сталі свабоднымі народамі СССР. Яны скінулі ўсе свае старыя шкарлупкі нацыянальнай абмежаванасці, нелюбві і дрэннага суседства паміж сабою і будуюць — у агульным, адзіным супрацоўніцтве соцыялістычную індустрыю і соцыялістычную сельскую гаспадарку. Усе народы і нацыянальнасці, якія насяляюць Совецкі Саюз, аднадушна сталі пад інтэрнацыянальны чырвоны сцяг вялікай партыі Леніна — Сталіна. **(Апладысменты).**

Іх дзеці і ў нашай доблеснай гераічнай Чырвонай Арміі, і на пазіцыях непагрэднай, штогадзіннай аховы граніц нашай вялікай бацькаўшчыны перагараджваюць шлях усім дыверсантам, шпіёнам міжнароднага фашызма. Фашысты імкнуліся і імкнуцца завесці ў праслойках нашага грамадства і нават у радах нашай партыі сваіх тайных замаскаваных агентаў. Фашысты вярбуюць гэтых агентаў сярод прэзрэнных трацкісцка-бухарынскіх бандытаў, буржуазных нацыяналістаў і іншых ворагаў народа.

Але нашы слаўныя абаронцы рэвалюцыі, у асобе першага маршала, слаўнага палкаводца доблеснай Чырвонай Арміі тав. Варашылава і слаўнага наркома соцыялістычнай чырвонай разведкі тав. Ежова, пры дапамозе ўсіх народаў і нацый СССР, бязлітасна знішчаюць ворагаў народа ўнутры саміх рэспублік і на ўсіх граніцах нашай вялікай радзімы — СССР. Наша краіна Советаў непрыступна для фашыстаў і ўсіх сусветных драпежнікаў імперыялізма.

Вялікая арганізатарская сіла партыі Леніна — Сталіна забяспечыла перамогу блока комуністаў і беспартыйных на выбарах у Вярхоўны Совет. Гэта перамога, дарагія таварышы дэпутаты Совета Нацыянальнасцей, паззесяцерае нашу магутнасць, узмацняе нашу цягу да чырвонай сталіцы вялікага Саюза ССР — да Масквы, як да свайго роднага горада, і нашу палкую любоў да вялікага рускага народа, першым узняўшага сцяг вялікай барацьбы за ўладу Советаў, за дыктатуру рабочага класа, за ўрачыстасць соцыялістычнай працы, за вялікую дружбу рабочых і сялян.

Дзякуй, гарачае дзякуй усяму рускаму народу! Вялікае дзякуй рабочым горада Леніна — калыбелі пераможнай пралетарскай рэвалюцыі! Гарачае дзякуй рабочым нашай чырвонай сталіцы — Масквы, іванаўскім ткачам і ткачыхам, рабочым Данбаса, Баку, Урала, Тбілісі, рабочым нашага чыгуначнага транспарту і ўсім працоўным горада і вёскі, ствараючым масавы стаханаўскі рух, які забяспечвае ўрачыстасць комунізма на адной шостай частцы зямнага шара. **(Бурныя апладысменты, якія пераходзяць у працяглую авацыю. Прывітальныя воклічы ў гонар вялікага садружаства народаў агалашаюцца на многіх нацыянальных мовах).**

Таварышы, віншуючы вас з вялікім днём адкрыцця першай сесіі Совета Нацыянальнасцей Вярхоўнага Совета СССР, я горача жадаю, каб мы з вамі ніколі не забывалі, што мы дэпутаты Вярхоўнага Совета — толькі слугі народа, паслухмяна ў нас. Праводзячы наказы народа, мы заўсёды натхняемся праменістымі вобразамі вялікага Леніна і творца соцыялістычнай Канстытуцыі, правадыра народаў, нашага любімейшага вялікага Сталіна. **(Бурныя апладысменты, якія пераходзяць у авацыю. Прывітальныя воклічы ў гонар таварыша Сталіна агалашаюцца на мовах народаў СССР).**

З гэтым кароценькім словам і пажаданнямі я абвяшчаю першую сесію Совета Нацыянальнасцей Вярхоўнага Совета СССР адкрытай. **(Бурныя апладысменты. Крыкі «ура!» Авацыя. Дэпутаты вітаюць таварыша Сталіна на сваіх родных мовах. Прывітальныя воклічы суправаджаюцца бурнай авацыяй, якая доўжыцца некалькі хвілін).**

М. КЛІМКОВІЧ

Аповесці для дзяцей М. Лынькова

«Пра смелага ваяку Мішку і яго слаўных таварышаў» (ДВБ—1937), **«Янка-парашутыст»** (ДВБ — 1937), **Міколка-паравоз»** («Полымя Рэволюцыі», кн. 2 і 3 за 1936 год). — **Аповесці для дзяцей.**

Напісаць апавяданне для дзяцей пісьменніку не так лёгка: патрэбна дадатковая работа над мовай, над прыстасаваннем сюжэта да дзіцячага ўзросту, дадатковае вывучэнне дзіцячага асяроддзя і г. д. Зразумела, як і ва ўсякай рабоце, тут могуць быць і ўдачы і няўдачы, могуць быць і такія цікавыя творы, як рэцэнзіруемыя тут аповесці М. Лынькова. Гэтыя аповесці, прынамсі дзве з іх, з'яўляюцца ўдачай пісьменніка. Калі параўнаць іх, дык самай удалай кніжкай з'яўляецца «Міколка-паравоз». Самай слабой, хоць і найбольш, здавалася-б, забаўнай з гэтых кніжак з'яўляецца «Янка-парашутыст».

Хочацца перш-на-перш адзначыць, што ўсе тры кніжкі даюць адпор «бестэндэнцыйнай плыні» у дзіцячай літаратуры. Яны вельмі зыразна — сюжэтам, тэматыкай і вобразамі накіроўваюць думкі дзяцей у бок актыўнага служэння рэволюцыі. Нават самая «малодшая» — «Пра храбрага ваяку Мішку і яго слаўных таварышаў», не глядзячы на свой напалову казачны характар, — востра, нават некальскі знарок падкрэслена ставіць пытанні палітычнага выхавання дзяцей. Пісьменнік як-бы паставіў мэту — паказаць, што пры сапраўднай мастацкасці твора палітычная тэндэнцыя не толькі не абяскровіць твор, не толькі не зробіць яго схемай, а, наадварот, надасць яму сілу ўздзейнічання, выкліча пераймание, палітурхнее думку юнага чытача на шлях назірання за навакольным жыццём, на шлях асэнсавання з'яў гэтага жыцця.

Возьмем казку пра малога медзвяжонка Мішку, наіўнага пестуна старой мядзведзіцы, што так нечакана трапіў на вайсковую службу.

Кажуць, што выдавецтва два гады вагалася: ці абнародаваць мішкавы прыгоды, ці пачакаць, пакуль выйдзе том граматы Чырдзянскай вайны, прысвечаны паходу Чырвонай Арміі на Варшаву, каб праверыць, у якім палку, пад якім камандаваннем і па якому маршруту ішлі храбры ваяка Мішка і яго слаўныя таварышы на Варшаву. Гэтыя ваганні выдавецтва, пры добрай перадачы іх « у асобах» самому медзвяжонку, — маглі-б прыбавіць у яго рэпертуар пару досыць цікавых нумароў, з якіх заўсёдатаі яго тэатра — чырвонаармейцы пасмяяліся-б здаровым смехам. Аднак, аўтару і ўдумлівому чытачу дзіцячай літаратуры гэты выпадак будзе здавацца смешным і забаўным толькі ў пачатку. Потым агорне сум: да таго-ж запаскудзіла соцыялагізатарская крытыка літаратурнае выхаванне не толькі дзесяткаў змен студэнцтва, але і чытачоў, што нават сур'ёзныя людзі трапілі ў палон соцыялагізатарства і «расcудку вопреки, наперекор стихиям» зыкідваюць «с ученым видом знатока» з пантальку збіваючыя «артыкульцы» не горш самога храбрага ваякі Мішкі.

Нас цікавіць, ці не даў М. Лынькоў людзям, сумняваўшымся ў карыснасці яго казкі, позад так зразумець тыя палітычныя тэндэнцыі, якія зусім выразна закладзены ў яго казцы пра медзвяжонка і яго таварышаў.

Не, не даў повада. І не толькі ў гэтай казцы, а і ў двух другіх аповесцях.

Якая асноўная тэма гэтых аповесцей, якая асноўная мэта, пастаўленая аўтарам пры напісанні іх? Асноўнай тэмай было гераізм у дзіцячым асяроддзі, мэтай гэтай аповесці было паказ таго, як становяцца героямі ў нашай совецкай краіне. І тэма і мэта вельмі патрэбныя і ўдзячныя. Да таго-ж яны ўдаліся аўтару.

Тэма пра геройства! Каго з дзяцей не цікавіла гэтая тэма, каго не захапляла яна! А тым больш у нашай краіне, дзе геройства становіцца характэрнай адзнакай совецкага чалавека, совецкага народа, дзе яно становіцца штодзённай з'явай у любым, нават зусім глухім, куточку краіны. І вось гэтую рысу — рысу абыдзённасці ў нашай краіне геройства, падкрэслівае сваімі апавяданнямі М. Лынькоў, паказваючы, як абставіны ствараюць герояў.

Гераічнымі справамі адзначаны шлях барацьбы Чырвонай Арміі супроць белапольскіх акупантаў. Гэтыя гераічныя справы імкнецца адлюстраваць М. Лынькоў у сваёй аповесці пра медзвяжонка. Побач з гэтым М. Лынькова цікавяць вясёлыя прыгоды самога медзвяжонка Мішкі. Медзвяжонак трапіў у рукі чалавека і дзякуючы сваёй здольнасці пераймання — нядрэнна выконваў ролю забаўніка пры раешніку-медзвяжатніку, паказваючы не толькі бытавыя карцінкі — як дзяўчына выглядвае жаніха, ці як старая з кіем ходзіць, а і паходку багача, паклоны бедняка, паводзіны хабарніка, папа. У руках добрага раешніка Мішка нядрэнна ілюстраваў насычаны народным гумарам раёк на народных гульбішчах.

Гэтыя карціны падалі М. Лынькову думку зрабіць Мішку героем апавядання з быту Чырвонай Арміі ў часе яе паходу на Варшаву. Абыгрызаючы ў духу народнага гумару ўчынкі мядзведзя, М. Лынькоў падмацоўвае іх вострым замыслам і фантазіяй чырвонаармейцаў, якіх забаўляў медзвяжонак. Пісьменнік правільна скарыстоўвае прыродазнаўчыя назіранні за жыццём медзвяжонка на волі і за яго пераймальнасцю на службе чалавеку, каб гумарыстычна іх абыгрываючы — шляхам аналогіі са свядомым чалавечым жыццём — падказваць свайму чытачу патрэбныя яму веды. Таксама зусім свядома пісьменнік узмацняе элемент казачнасці (ні на хвіліну не адрываючыся ад рэалістычнай верагоднасці) тады, калі яму патрэбна весці сваіх чытачоў да кульмінацыйнага пункту апавядання.

Пытанне пра тое, казка гэта ці быль, не турбуе чытача. Тут паўтараецца справа з народнымі казкамі, якія ў сваёй аснове будуюцца як зусім рэалістычныя апавяданні: рэальныя ўзаемаадносіны паміж людзьмі, рэальныя нягоды і радасці героя, што выклікаюць гарачае спачуванне ў чытача, прымушаюць апошняга прыняць за верагоднае фантастыку асобных месцін казкі, не паглыбляючыся ў іх, не аналізуючы іх. Таму з такім захапленнем усprымае чытач малаверагодныя лётніцкія прыгоды Мішкі і зусім непатрэбныя і лішнія прыгоды Мішкі—кавалерыста (прыкрая па сваёй няўмеснасці і непатрэбнасці гісторыя з мулам).

Літаратурны прыём аўтара, заснаваны на асваенні рэалізма народнай казкі, варта падкрэсліць асабліва. У гэтым крыецца адзін з сакрэтаў поспеху кнігі. Веданнем і правільным разуменнем народнай казкі тлумачу я самы выбар М. Лыньковым персанажаў для сваёй казкі — персанажаў, знаёмых юнаму чытачу па дзіцячых казках. Дзіцё іх ведае і любіць з самых малых дзён і вельмі ўдзячна пісьменніку, што ён вывеў гэтыя персанажы ў іншых, чым у вядомых яму казках, абставінах, паказаў іх жыццё больш змястоўным, паказаў іх карыснасць чалавеку. Дзіцё, прачытаўшы гэтую кніжку, адчувае, што ў яго стала больш ведаў, больш думак пра жыццё, хоць увесь час яно чытае вельмі вясёлыя апавяданні пра жыццё звычайнага наіўнага медзвяжонка. Дзіцё неўзаметкі для сябе пашырае свой кругагляд новымі ўражаннямі, адчуваннямі, ведамі.

У гэтым асноўная карыснасць кнігі М. Лынькова пра Мішку і яго таварышаў: яна шчасліва спалучае вельмі цікавы, некалькі прыгодніцкі, матэрыял з раззязаннем вельмі сур'ёзнай праблемы палітычнага выхавання дзіцяці і дае яму рад ведаў. Другі дадатны бок аповесці, што яна напісана жывой народнай мовай. Чытаеш кніжку — і здаецца, што вясёлы настаўнік у вольную хвіліну зырашыў пазабавіць сваіх вучняў цікавым апавяданнем—казкай. Таму прыходзіцца прабачыць і некаторыя адступленні ад звычайных граматычных правіл, якія асабліва абавязковы для твораў, пісаных для дзяцей: дзіцё яшчэ малое, каб аналізаваць паэтычныя вольнасці і адхіленні. У школах рэдка звяртаецца ўвага на развіццё зобразнай мовы ў дзіцяці, — наадварот, яркую, маляўнічую мову дзяцей звычайна засушваюць трафарэтамі дыктовак, лекцый, задачнікаў. Кніжка пра храбрага ваяку Мішку прызучае любіць сакавітае народнае слова, народны гумар.

Гэта ў меншай меры можна аднесці да другога апавядання «Янка-парашутыст», якое наогул слабей за першае, не глядзячы на тое, што магчымасці тут былі не меншыя, а большыя, бо пісьменнік узяў героямі расказа пра парашутызм не медзвяжонка, які, як-ні-як, звязваў магчымасці аўтара, а групу дзяцей — балельшчыкаў парашутнай справы. Справы з тнілым парасонам, прыгоды ката, які нечакана для сябе становіцца лётчыкам, — расказаны таксама, як і ў прыгодах Мішкі, у гумарыстычных тонах, але за гэтым гумарам ужо не адчуваецца моцнага сюжэтнага касцяка, не адчуваецца ідэі твора і каб не няшчасны выпадак з Янкам у канцы кнігі, яна-б не зрабіла на чытача колькі-небудзь моцнага ўражання. Напіраючы на гульню дзяцей (відаць, і гэтая кніжка разлічвалася, па крайняй меры ў першай яе частцы, на малодшы ўзрост) — М. Лынькоў не скарыстаў сваіх магчымасцей паказаць дзецям парашутызм (зразумела, у даступнай для іх форме), карыснасць гэтага спорту і яго патрэбнасць для краіны. Несур'ёзнае стаўленне да парашутызма і канцоўка кнігі (якая не можа выклікаць асаблівага захаплення парашутызмам у дзяцей)—зніжае і палітычна-выхаваўчае і практычнае значэнне кнігі. Расказ пра скарыстанне парашутных прыжкоў доктарам, якому трэба ратаваць хворага ў мясцовасці, дзе не мог прызямліцца самалёт, скарыстанне парашута для пошты, для медыкаментаў, паказ парашутнай справы на манеўрах Чырвонай Арміі, навуковыя паветраныя зонды — ды ці мала чаго ёсць паказаць, расказваючы пра парашутную справу, нават для дзяцей малодшага ўзросту!

Аповесць «Міколка-паравоз» пабудавана так, як і першыя дзве аповесці. Спачатку бытавыя сцэны ў сям'і героя, здобраныя гумарам. Потым абставіны змяняюцца і герой крута ідзе да гераічных учынкаў. Аднак, аповесць вызначаецца радам дадатных бакоў, якія даюць праза высока ацаніць гэтую аповесць. Перш-на-перш гэта жыццёрадаснае, апавяданне пра досыць цяжкое дзяцінства Міколкі, сына рабочага-чыгуначніка, сям'я якога жыла ў старым таварным вагоне. Маці — забітая горам жанчына і дзед — стары мікалаеўскі салдат у адстаўцы — вось асноўныя выхавальнікі Міколкі. Бацька, машыніст, мог-бы даць больш свайму сыну, але ў яго раз'язная работа, падпольная рэволюцыйная дзейнасць, а потым яго і зусім пасадзілі ў турму і Міколку прышлося даходзіць да сэнсу падзей самастойна. Вучоба была цяжкой: за бязбожнасць пападала ад маткі, за непавагу да цара — ледзь не скалечылі жандары, за непавагу да «буржуя» — выкінулі з хаты, за сувязь з рэволюцыйным падполлем — нямецкія акупанты прысудзілі да расстрэлу. Але ўсе гэтыя здарэнні не зламілі ўпартага характару малыша, яны загартоўвалі яго маладую душу, падрыхтоўвалі Міколку да барацьбы супроць буржуяў і акупантаў. І другая палова кніжкі напоўнена геройскімі ўчынкамі маладога партызана. Не глядзячы на іх фантастычнасць, большай частцы іх малады чытач дадуць веры: папярэднія прыгоды Міколкі(у тым ліку выратаванне большэвікоў з пакгауза) падрыхтавалі патрэбную глебу.

Мне здаецца, што тут М. Лынькоў штоні-што пераняў ад Гашэкавых «Прыгод бравага салдата Швейка», дзе за наіўнасцю бравага салдата хаваўся глыбокі сэнс, — нават у найбольш незерагодных становішчах, у якія трапляў герой рамана. Зразумела, аналогіі тут правесці немагчыма, бо героі ў Гашэка і ў Лынькова зусім розныя.

Якія-ж недахопы ў гэтай аповесці? Перш-на-перш некаторыя прыкрыя памылкі, агаворкі, якія ідуць ад няўважлівасці аўтара. На міколкавай хаце (загоне) ён вывеў крэйдаю: «20 чалавек, 8 коней». Такія надпісы з'явіліся ў вайну, а міколкава хата была знята з колаў далёка да ваеннага часу і такога надпісу на ёй быць не магло. У другім месцы — Міколка выззаляе ўначы большэвікоў: Павел падае яму сігналы — падымае руку. На справе гэтага, вядома, быць не магло, бо не толькі Міколка, але і немец заўважыў-бы Паўлавы сігналы. Але гэта дробязь. Другія, больш істотныя, недахопы ідуць па лініі падабенства архітэктонікі твораў М. Лынькова — твор пра Мішку падобны да твора аб Міколцы настолькі, што гэта могуць заўважыць і дзеці. Каб унікнуць гэтага, у «Міколцы-паравозе» зусім не трэба было так распісваць чарговую няўдачу з вужом, альбо знаёмства з царом. Абодва гэтыя эпізоды, як і эпізод з мулам у апавяданні пра Мішку, прылеплены некалькі штучна. Валодаючы багацейшым матэрыялам, М. Лынькоў, як відаць, не ўстрымаўся ад спакусы скарыстаць не толькі тое, што патрэбна, але і тое, што цікава, але лішне ў творы. Таму атрымалася такая змена бытавых карцін гераічнымі, што агаліўся план апавядання. Другім істотным недахопам з'яўляецца тое, што М. Лынькоў не заўсёды адчувае меру ў дапушчэнні верагоднага. Таму ён прымушае Міколку сесці перад нямецкім палкоўнікам у часе допыту, чаго ў сапраўднасці быць не магло. На падобныя рэчы М. Лынькова часта спакушае пагоня за трапна сказаным жартам; пісьменнік забывае, што ён сам павінен весці матэрыял, а не ісці за матэрыялам. Трэці буйны недахоп усіх трох кніжак у тым, што пісьменнік у пагоні за гумарыстычнымі сітуацыямі часамі адмаўляецца ад задачы прывіцця дзіцяці пашаны да старэйшага, хоць у апошняй кніжцы гэта руйнуецца заключнымі главамі, якія рысуюць адносіны Міколкі да бацькі і дзеда.

Рэзюміруючы ўсё вышэй сказанае, трэба прызнаць, што з'яўленне аповесцей М. Лынькова для дзяцей трэба вітаць, як вельмі карысную справу і для пісьменніка і для нашай совецкай дзетвары. Гэтыя творы пашыраюць круг дзейнасці пісьменніка, узбагачаюць яго новымі назіраннямі, уражаннямі і ведамі, якія спатрэбяцца яму не толькі ў творах для дзяцей. Гэтыя аповесці ўзбагачаюць літаратуру новымі высокамастацкімі рэчамі, дапамагаючы дзецям знаёміцца са стылем пісьменніка, яго манерай пісьма, набліжаючы пісьменніка да такой удзячнай аўдыторыі, як дзіцячая.



Кадр з фільма «Ленін у Кастрычніку». НА ЗДЫМКУ: нар. арт. рэсп. Б. Шчукін у ролі В. І. Леніна, арт. Ахлопкаў у ролі Васілія.

ВЯЛІКІ ПОСПЕХ ВЫДАТНАГА ФІЛЬМА

Велізарным поспехам у беларускага гледача карыстаецца фільм «Ленін у Кастрычніку». З вялікім натхненнем глядзяць яго працоўныя Совецкай Беларусі. Залы кіно-тэатраў заўсёды перапоўнены. Гледачы пасля сеансаў ухвалявана дзеляцца ўражаннямі аб фільме, гавораць аб вялікім Леніне і кастрычніцкіх днях.

У Менску фільм прагледзела ўжо каля 100 тысяч чалавек, па Віцебску — звыш 50 тысяч. Днямі фільм пачне дэманстравацца ў гарадах і раёнах БССР.

ЖЫЦЦЁВАЯ ПРАЎДА

Прагледзеўшы мастацкі, гісторыка-рэволюцыйны фільм «Ленін у Кастрычніку», мы выйшлі з кіно-тэатра ўзрушаныя, са слязамі на вачах. Калі мы, удзельнікі Кастрычніцкіх дзён, глядзелі гэты фільм, мы адчувалі сябе гэтак-жа як у тыя гарачыя, трывожныя дні, што былі 20 год назад. І кожны з нас, хто бачыў гэтую карціну, з ахвотаю пацвердзіць, што гэта—не вымысел, а жыццёвая праўда. Што-небудзь не прызнаць ці змяніць у гэтай карціне нельга. Можна толькі яшчэ і яшчэ дадаць, але ясна ,што адным фільмам усяго не ахапіць.

У наступных фільмах, прысвечаных Кастрычніку, хацелася-б бачыць рад характэрных эпізодаў, якія не ўвайшлі ў гэты фільм. Успамінаем, напрыклад, такі: абстралянымі юнкерамі быў выкінуты белы сцяг, які азначаў, што яны здаюцца. Але гэта аказалася зверскай правакацыяй — пры набліжэнні чырвонагвардзейцаў юнкеры адкрылі страляніну. Цікава будзе ў наступнай карціне ўбачыць яшчэ так-званы «жаночы батальён».

Вельмі добра паказаны ў фільме збор чырвонагвардзейцаў у Смольным, барацьба рабочых за захаванне зброі. Выдатныя ўсе масавыя сцэны. І цудоўнае выкананне народным артыстам СССР Б. Шчукіным ролі В. І. Леніна. Вобраз Ільіча перададзены вельмі жыццёва, але, зноў-такі ён далёка не вычарпаны. Ды гэта і немысліма зрабіць у адным фільме.

Няхай моладзь глядзіць гэты выдатны фільм і натхняецца для будучых баёў за перамогу комунізма ва ўсім свеце!

КАРУНОЎ, РАЗГІЛЬДЗЕЕЎ, ЗАХАРАЎ.
Удзельнікі Кастрычніцкай рэволюцыі і штурма Зімняга палаца, былыя чырвонагвардзейцы — зараз рабочыя суднабудаўнічага завода імя Жданава.

СЭРЦА ПОЎНІЦЦА ГОРДАСЦЮ І РАДАСЦЮ

Калі глядзіш фільм, здаецца, што ты разам з Леніным удзельнічаеш у барацьбе, і вось Ленін ласкава дакрануўся да твайго пляча і ўсміхаецца сваёй цёплай усмешкай. Забываеш, што гэта актор выконвае ролю Леніна. Бачыш жывога Леніна, які вядзе народныя масы на барацьбу. Ц[illegible] ўпэўненасць у перамозе, непахісная воля правадыра, асабістая скромнасць і любоў да народа з'ядналіся ў адно цэлае ў гэтым геніяльным чалавеку.

Ёсць у фільме шмат такіх момантаў, калі хочацца ўстаць, схапіць зброю, абараніць Леніна, сваімі рукамі задушыць ворага.

І калі канчаецца фільм, у сэрцы прачынаецца пачуццё нездавальнення тым, што ты проста глядач і не ўдзельнічаў у гэтай барацьбе, не быў з Леніным, не дапамагаў яму. Але насустрач гэтаму пачуццю паўстае другое пачуццё таго, што ты прымаеш удзел у завяршэнні пачатай Леніным справы — у пабудове шчаслівай соцыялістычнай краіны.

З напоўненым гордасцю і радасцю перамогі сэрцам пакідаеш кіно-тэатр.

К. і В. ЕЎСЮЦІНЫ.
Работніцы-ордэнаноскі фабрыкі «Кастрычнік».

„ПОЛЫМЯ РЭВОЛЮЦЫІ“

(Кніжкі 11-я і 12-я за 1937 год)

Днямі падпісчыкі атрымалі 12-ты нумар «Полымя Рэволюцыі». У хуткім часе атрымаюць і... адзінаццатую кніжку журнала за мінулы год.

Юбілейны, прысвечаны XX-годдзю Вялікай Кастрычніцкай рэволюцыі,—11-ты нумар журнала выходзіць у палове студзеня, з двухмесячным спазненнем! Гэта недаравальна ні рэдакцыі журнала, ні Саюзу совецкіх пісьменнікаў БССР.

Што змешчана ў гэтых нумарах журнала?

11-ты нумар адкрываецца вершамі Янкі Купалы — «Аб Сталіне сейбіту» і Якуба Коласа — «Мы славім правадыра» і «Да дня XX гадавіны». Вялікага правадыра народаў, «таго, чыё імя — штандар перамог» — таварыша Сталіна, нашу квітнеючую соцыялістычную радзіму ўслаўляюць пафасна-ўзнятыя, прасякнутыя глыбокім пачуццём любві да правадыра і радзімы, хвалюючыя вершы нашых народных паэтаў.

Проста і шчыра напісаны лірычныя вершы Пятра Глебкі — «Пілотам», «Палёт», «Радасць», «Вялікая радасць зямлі». Радасць, шчасце і мужнасць людзей краіны Советаў — вось тэмы эмацыянальных, майстэрскіх вершаў Пятра Глебкі.

Надзвычай адказную і вялікую задачу — даць вобраз правадыра — паставіў перад сабой Мікола Хведаровіч у сваім вершы «Сталін». Але вырашыць яе належным чынам паэт не здолеў. Непрадуманасць і невыразнасць асобных радкоў (у першых двух страфах) знізілі ідэйную і мастацкую вартасць усяго твора.

У гэтым нумары журнала змешчана паэма маладой паэтэсы Эдзі Агняцвет «Фелікс Дзержынскі». Трэба адзначыць як недахоп паэмы тое, што Агняцвет не выкарыстала многіх хвалюючых эпізодаў герaічнага жыцця барацьбы Ф. Э. Дзержынскага, таму ў паэме не дадзен з патрэбнай паўнатой вобраз бясстрашнага рыцара рэволюцыі.

Ёсць у паэме, асабліва ў першых раздзелах, няўдалыя, наіўныя параўнанні («ён танклявы і высокі, нібы таполя кіеўскіх вышынь»), неапрацаваныя радкі («чалавек хацеў жыцця з святлом» і інш.).

Найбольш удаліся эпізоды «Чэка» і «Апошняя прамова», напісаныя пафасным вершам. У гэтых раздзелах дадзены яркія рысы зобраза выдатнага сына большэвіцкай партыі, які да апошняга ўдару сэрца герaічна змагаўся за справу Леніна — Сталіна, чыё імя натхняе нас на барацьбу з ворагамі народа, — Фелікса Эдмундавіча Дзержынскага.

Паэма «Фелікс Дзержынскі» — творчае дасягненне маладой паэтэсы.

Як у 11-м, так і ў 12-м нумарах журнала мы знаходзім рад вершаў маладых і пачынаючых паэтаў — М. Калачынскага, А. Бачылы, М. Сямашкі, В. Сасноўскага. Роскіт і шчасце жыцця совецкай краіны натхняюць маладых паэтаў. Аб нашай радзіме, калгаснай заможнасці, шчаслівай маладосці пішуць яны.

У вершах пачынаючых шмат недапрацаванасці, якой можна было пазбавіцца пры больш сур'ёзнай рабоце журнала з маладымі аўтарамі. Напрыклад: у вершы А. Бачылы «Над Уралам» чытаем:

«Бралі прыступам смяротны гул байніц».

Калі-б рэдакцыя ўказала паэту на тое, што «гул» ніякім прыступам не возьмеш, відаць, «бралі байніцы», — радок быў-бы паэтам выпраўлен, недарэчнасцяў не было-б.

У гэтых нумарах журнала надрукавана і драматычная паэма Міх. Клімковіча «Кацярына Жарнасек». Паэма пабудавана на матэрыялах далёкага мінулага — гістарычных падзеях XVI стагоддзя.

Аўтар расказвае аб пакутах прыгонных сялян, аб жорсткім уціску іх беларускімі і польскімі магнатамі, дае эпізод паўстання беларускіх прыгонных сялян у братнім яднанні з казакамі Украіны супроць польскіх захватчыкаў, супроць драпежнікаў-феадалаў. Аўтар стварыў яркія вобразы — Кацярыны, Рыгора, дзеда Ахрэма — прадстаўнікоў народных мас. У паэме багата выкарыстаны беларускі і украінскі фальклор — гэта яе дадатная якасць. Але твор яшчэ патрабуе ўдасканалення верша, працы над мовай, а галоўнае — больш поўнага акрэслення асноўных персанажаў, адзінства сюжэтнай лініі, драматургічнай дапрацоўкі. Аднак і ў сваім літаратурным варыянце «Кацярына Жарнасек» — значны для нашай літаратуры твор.

Проза ў разглядаемых нумарах прадстаўлена творамі Р. Мурашкі, Ю. Віцьбіча, Ул. Глазырына і маладых празаікаў В. Кандрацені і У. Краўчанкі.

З цікавасцю чытаецца апавяданне Р. Мурашкі «Цішча». Пісьменнік даў тыповы вобраз лютага драпежніка-кулака, яго твор выхоўвае ў чытача нянавісць да заклятых ворагаў народа.

Некалькі суха напісана навела Ул. Глазырына «Перад расстрэлам», якая падае нам эпізод з часоў грамадзянскай вайны.

З твораў маладых вылучаецца аповесць В. Кандрацені «Каханне». Цікавы сюжэт, сакавітая вобразная мова, лірызм — вось дадатныя якасці аповесці, якія сведчаць аб здольнасцях маладога аўтара.

Добрай мовай напісаны апавяданні Ю. Віцьбіча — «Студзенецкія салаўі» і «Марыля». У першым Віцьбіч расказвае аб совецкіх пагранічніках. Але мастацкую вартасць гэтага твора зніжаюць непрадуманасць, штучнасць многіх месц (размова дзеда з калгаснікам па дарозе ў Студзенец, эпізод знішчэння дзедам сваіх барадзкак, даверлівасць пагранічнікаў і начальніка заставы да дзеда і інш.). І тое, што сюжэт пабудаваны на фальшывых, непраўдзівых дэталях, — вялікая загана апавядання. Малюнак праклятага мінулага — часоў панавання на Беларусі польскіх захватчыкаў дае Віцьбіч у апавяданні «Марыля».

Цікавае па тэме апавяданне У. Краўчанкі «На параходзе». Але перагружанасць аднолькавымі эпітэтамі — «бліскучая лагуна», «бліскучыя вочы», «бліскучае цела», залішняя стылізацыя мовы старога яўрэя (некрытычнае пераймание ў Бебеля) з'яўляюцца буйнымі заганамі апавядання.

12-я кніжка журнала прысвечана найвялікшаму паэту Грузіі Шота Руставелі, 750-гадовы юбілей якога адзначала грамадскасць Совецкага Саюза ў канцы снежня 1937 года. Таму пачэснае месца ў журнале дадзена перакладам на беларускую мову раздзелаў геніяльнай паэмы Шота Руставелі «Віцязь у тыгравай скуры», якія зроблены паэтамі М. Хведаровічам, П. Броўкам, А. Александровічам і А. Гурло.

Трэба проста сказаць, што якасць перакладаў пакідае жадаць лепшага. Асаблівае нездавальненне выклікае пераклад уступу да паэмы, зроблены М. Хведаровічам. У гэтым перакладзе абеднена прыгожая, сакавітая мова Руставелі і нават груба скажоны тэкст. Для прыкладу параўнаем пераклад паэмы на рускую мову — Г. Цагарэлі і пераклад М. Хведаровіча (пераклад Хведаровіча блізкі да перакладу Цагарэлі і гэта дае права зрабіць такое параўнанне).

Першыя радкі паэмы ў перакладзе Цагарэлі гучаць так:

«Ты воздвиг безмерной мощью из хаоса
мирозданье.
Тварей оживил, дыханьем вея с тверди
голубой».

А ў перакладзе Хведаровіча:

«Ты магутнасцю бязмернай свету даўшы
існаванне,
Ажывіўшы ўсё жывое, на планеце
нежывой».

«Ажывіўшы жывое!» — большай недарэчнасці і ўявіць нельга. І калі планета нежывая, дык што жывое, ды яшчэ патрабуючае ажыўлення, можа быць на ёй? Страшэнную бязглуздзіцу прыдумаў перакладчык.

Далей — у Цагарэлі:

«Возвеличив Ториэля, вознесем его над
миром —
Трем героям, **верным дружбе**, путь
единый предрешен».

У Хведаровіча:

«Узвялічам Тарыэля, узнясём яго над
светам —
Тром героям вечнай дружбы (?!) —
будзе спадарожнік (?!) ён.

Зноў недарэчнасць, неразуменне тэксту Руставелі.

У рускім перакладзе страфа «Стих у третьих — для забавы...» канчаецца так:

«И такой приятно слушать, если ясен
смысл напева.
Но лишь в сказе величавом виден
истинный поэт».

Пераклад:

«І такі прыемна слухаць, калі думкі ў
ім багата —
Ў мудрым сказе і магутным бачны
творца і паэт».

Супроцьстаўленне выпала. Перакладчык, сказіўшы сэнс, сказаў адваротнае таму, што пісаў Руставелі.

Ростэван, які аддаў трон дачцы Тінацін, гаворыць ёй:

«Без зова навещать меня должна».

Пераклад: «Без запрашэння ты наведвай царскі дом». Тінацін-жа, як царыца, і не пакідае царскага дому. Справа ідзе аб наведванні дачкой Ростэвана ў яго пакоях. Няўжо і такой простай рэчы не здолеў зразумець перакладчык?

Яшчэ прыклад: Аўтандзіл гаворыць свайму слузе Шармадзіну: «Решенью подчинись, как воле брата». У перакладзе: «Тваё рашэнне (!?) хай мне будзе воляй брата». Зноў скажэнне: радок перакладзены адваротна таму, чаго патрабуе сэнс. Можна яшчэ дадаць прыклады: «Сладкозвучная песня» перакладаецца як «невымоўная», «кипит ненависть» — «крыўду копіць»; «повелитель прав!» — «божа пакараў!» і г. д., і г. д. Зразумела, што гэты пераклад ніяк не можа задаволіць чытача.

Грубыя скажэнні, недарэчнасці ёсць і ў перакладах іншых раздзелаў паэмы Шота Руставелі. Возьмем, напрыклад, раздзел «Грамата Аўтандзіла васалам», перакладзены А. Александровічам.

У рускім тэксце чытаем:

«Пиршествам и состязаньям **предпочтя**
печаль изгнанья.
Ухожу — меня прокормит лук и верная
стрела».

Александровіч перакладае, робячы сэнс якраз адваротным:

«**Лепш** спаборніцтвы, банкеты, чым
самотны час выгнання.
Лук і верная страла мне супакойваюць
душу».

«Наше царство» перакладаецца наадварот: «заша царства». Просты і зразумелы радок: «удалялся быстрым скоком» робіцца перакладчыкам недарэчным: «**адыходзіў** быстрым **скокам** (?!). Выраз: «возвратились приближенные с охоты» чамусьці перакладаецца так: «слугі **прыляцелі** з паляванне».

Журнал, змясціўшы неахайныя, недапрацаваныя пераклады, якія з'явіліся «крывым люстрам», апошліў і сказіў геніяльны твор вялікага паэта.

Памылкай, якая з'явілася ў выніку бескантрольнага падыходу да падбору матэрыялаў, трэба лічыць і змяшчэнне рэдакцыяй у гэтым нумары ўрыўка з кнігі А. Дандурава пра Шота Руставелі. Гэтая непісьменная, блытаная і безадказная «страпня», справядліва асуджаная цэнтральным друкам, дэзарыентуе чытача.

Два астатніх артыкулы пра Шота Руставелі праф. Барамідзе і Джанілідзе таксама не даюць чытачу поўнага ўяўлення аб геніяльным творы Шота Руставелі і соцыяльна-палітычным жыцці той эпохі, у якую жыў і тварыў паэт. Такім чынам, рэдакцыя не здолела даць ні дастойных перакладаў, ні задавальваючых патрабаванні чытача артыкулаў пра вялікага майстра слова грузінскага народа.

У раздзеле публіцыстыкі разглядаемых нумароў ёсць яшчэ два артыкулы В. Вольскага і А. Кучара — «Беларуская совецкая літаратура за 20 год» (у № 11) і праф. М. Дабрыніна — «Вялікі помнік сусветнага мастацтва» (№ 12).

В. Вольскі і А. Кучар у сваім нарысе расказалі аб развіцці беларускай совецкай літаратуры за дваццаць год і зрабілі ў асноўным правільны разгляд творчасці беларускіх паэтаў, пісьменнікаў і драматургаў.

Каштоўны для чытача і артыкул праф. Дабрыніна, напісаны да 750-годдзя выдатнага твора старой рускай літаратуры — «Слова аб палку Ігараву». У артыкуле дадзены пераказ зместу і зроблены падрабязны аналіз «Слова».

Якія можна зрабіць вывады?

Рэдакцыя журнала мала працуе з маладымі аўтарамі над павышэннем мастацкай якасці іх твораў. Рэдакцыя не павінна абмяжоўвацца толькі прыняццем твора маладога пісьменніка ў друк, а клапатліва вырошчваць пісьменніка, імкнучыся да таго, каб і творы маладых сталі на высокім мастацкім узроўні, маглі быць карыснымі і цікавымі для чытача. З большай адказнасцю журнал павінен адносіцца да друкавання перакладаў на беларускую мову выдатных твораў пісьменнікаў братніх народаў. Трэба змагацца за культуру перакладаў з тым, каб беларускаму чытачу даць пераклады, дастойныя арыгіналаў. Рэдакцыя павінна, нарэшце, сур'ёзна і ўдумліва падыходзіць да змяшчэння публіцыстычных матэрыялаў, каб правільна арыентаваць чытача ў асноўных пытаннях літаратуры і дзейсна змагацца за мастацтва, вартае нашай вялікай соцыялістычнай эпохі.

Р. ЮРЫН.

Г. БЯРОЗКІН

ЛІРЫКА ПЯТРУСЯ БРОЎКІ

(П. Броўка—„Вясна радзімы“, ДВБ, Менск, 1937)

Агульная выразнасць лірыкі, як ні аднаго іншага віду слоўнай творчасці, самым непасрэдным чынам залежыць ад суб'ектыўна-эмацыянальнай афарбоўкі слова. Зусім не дасягае мэты, г. зн. не выклікае адказных пачуццяў чытача такі лірычны твор, які падаецца паэтам у выглядзе адцягнена-сэнсавай канструкцыі, замест індывідуалізаванай, сагрэтай асабістым перажываннем, паэтычнай мовы. Рытарычная інтанацыя Маякоўскага праекцыравалася, як інтанацыя лірычная. Прычым, разуменне «лірызма», «эмацыянальнасці» Маякоўскі карэнным чынам пераўтварыў. Многія паэты ў пошуках эмацыянальнай выразнасці верша вельмі часта звярталіся не да ўнутранай сутнасці свайго пачуцця, не да патрабаванняў жывой палітычнай тэмы, а да агульнапрынятай імітацыі «задушэўнасці», што адной-чы ўстанавілася ў паэтычнай традыцыі. У адрозненне ад іх Маякоўскі пракладваў шляхі лірыцы, не прыстасаванай да чужых узораў, не падагнанай да раней адбыўшагася паэтычнага факта, а скроенай па ўласнай мерцы вялікага чалавечага сэрца. У справах і людзях пролетарскай рэволюцыі Маякоўскі адкрыў невычэрпную крыніцу лірычнай творчасці.

Якія гэта мае адносіны да паэзіі Броўкі? Адносіны самыя непасрэдныя. Броўка пайшоў ад вершаў адцягненых, ад вершаў з падкрэслена «надіндывідуальнай» паэтыкай, да вершаў, у якіх паэт прысутнічае ў якасці неадзялімай часткі самой тэмы. Ці значыць гэта, што Броўка піша выключна на вузка-асабістыя матывы? Не. Бо паэтычны вопыт Маякоўскага рашуча абвергнуў уяўленне аб лірыцы, як паэзіі выключна аб каханні. Паэтычнымі тэмамі Броўкі з'яўляюцца вузлавыя тэмы нашай рэчаіснасці. Але з паверхоўна зразуметага «соцыяльнага заказу» публіцыстычная тэма Броўкі ператварылася ў тэму ўнутрана-абавязковую і арганічную. Адбылося прыкметнае паглыбленне палітычнай тэмы і гэтае змяненне ідэйнага парадку не магло не пацягнуць за сабой цэлага раду змен канкрэтна-паэтычных.

Першапачатковы этап паэтычнай работы Броўкі ў вельмі слабой меры адлюстроўваў станаўленне індывідуальнага голасу паэта. Большасць вершаў з кніг «Гады як шторм», «Цэхазыя будні» была прынцыпова абязлічанай. У іх сказвалася фальшывая ўстаноўка паэта на верш сярэдняга стандарту. Палітычная тэма гэтых вершаў падавалася ў сваім аголёным выглядзе, не ўзбагачаная дадатковай тэмай паэта. Паэтычнае слова Броўкі не падавалася з той індывідуальнай інтанацыяй, якая ў сваю чаргу, становячыся адным з фактараў сэнсавага руху верша, надае яму непаўторную пераканаўчасць і жыццёвасць.

Адной з першых спроб Броўкі адыйсці ад стандартызаванага верша «наогул» з'яўляецца цыкл вершаў «Клімент Ефрэмавіч» У гэтых вершах Броўка ўпершыню выявіў гэтак характэрную для яго паэтычнага дараванне песенную інтанацыю, прычым інтанацыю не традыцыйна-меладыйнага паходжання, а вырасшую з распрацаванага совецкімі паэтамі інтанацыйна-вершавага строя.

Далейшым крокам у паглыбленні тэмы і набыцці сапраўднай канкрэтнасці з'явіўся цыкл вершаў на антымілітарысцкія тэмы. У вершы «Пра вайну» Броўка адлюстраваў шалёную падрыхтоўку фашызма да новай сусветнай бойні, накіраванай у першую чаргу супроць Совецкага Саюза. «Гэта зноў пагражае яна — узброеная да зубоў вайна...»

Дык вось,
калі зноў пагражае яна —
узброеная
да зубоў
вайна,
Рыхтуйся, таварышы,
так шугануць —
гэтую вайну! —
Каб усюды
прадвеснікам волі
яна —
зыходзіла вайна.

Асаблівая выразнасць і дзейснасць гэтага верша самым відавочным чынам дасягнута ўдалым размяшчэннем цэлага раду вершавых элементаў. Асноўным з іх з'яўляецца паслядоўна праведзены інтанацыйны рух, узрастаючы разам з сэнсавым рухам верша. Атрымаўся гібкі, выразны верш. Беспамылкова дасягае мэты ўжыты Броўкам прынцып складання акцэнтуемага слова «вайна» і высоўвання яго на грань радка ў якасці рыфмуемага слова. Броўка добра зразумеў сваю задачу — даць баявы палітычны верш антываеннай накіраванасці, і ўсе наяўныя ў яго распараджэнні паэтычныя сродкі ён паставіў на службу лепшаму выкананню гэтай задачы. Так напісаны лепшыя вершы Броўкі.

Сярод іх варта ў першую чаргу адзначыць цыкл вершаў «Праз горы і стэп», напісаны «паводле гістарычных матэрыялаў Самарскай каўдывізіі». У гэтых вершах атрымала сваё найбольшае выражэнне ўстаноўка паэта на аратарска-дэкламацыйны стыль у паэзіі, менш за ўсё разумеемы ім у сэнсе «віціјства» ці одыёзнасці. У вершах «Праз горы і стэп» баец-чырвонаармеец расказвае пра былыя паходы Чырвонай Арміі, якой у надзвычайна цяжкіх умовах гор, буранаў, тыфу прыходзілася змагацца супроць белых банд. Вершы гэтыя атрымоўваюць гарачы водгук у чытача не толькі таму, што апісваемыя ў іх падзеі блізкія свядомасці совецкага чалавека, але і таму, што паэт расказвае аб гэтых падзеях добра, праўдзіва, у плане горача хвалюючага яго перажывання. Калі падыходзіць да вершаў «Праз горы і стэп» з пункту гледжання звычайных версіфікатарскіх пошукаў, у іх лёгка знайсці не мала пагрэшнасцей, ці то ў форме рытмічнай неўраўнаважанасці, ці ў некаторай гіпербалізацыі, непрывычнай для «гладкай», «эмансіраванай» паэзіі і т. д. Аднак «няправільныя» вершы «Праз горы і стэп», непадагнаныя пад размер радкі:

Чулі вы,
што такое бурун?!
Гэта —
дзікія лавы вятроў,
Гэта пекла раз'юшаны рогат.
На пухоўках пяскоў
у такую пару
Акалее шакал,
а не знойдзе дарогі... —

з'яўляюцца сапраўднай жывой паэзіяй. Яе сіла ва ўнутранай праўдзівасці пачуцця, у гарачым баявым пафасе, у тым, што за рытарычным голасам паэта ўгадваецца жывы чалавечы характар, а не роўнадушны радыёрупар. Праўдзівасцю чалавечага пачуцця і перажывання апраўдваецца імклівасць рытмічных пераходаў, моцная гіпербалізацыя паасобных з'яў («нават конскія слёзы зрываюць супоні»), некаторая «вольнасць» у абыходжанні з граматыкай («расплываўся агнём распадлюга кадэт»). Увесь аратарска-дэкламацыйны строй паэмы «Праз горы і стэп» падмацоўваецца глыбока эмацыянальнай, арганічнай інтанацыяй паэта. Адтаго ён выразны і праўдзівы. Такімі-ж правільна знойдзенымі суадносінамі паміж тэмай і сродкамі яе выражэння, паміж сэнсавым прызначэннем слова і яго выразнасцю характэрны невялікі, але яркі і дзейсны верш Броўкі «Зямля».

Значна слабей напісаны тыя вершы, у якіх паэтычны голас Броўкі не ў дастатковай меры выяўляе канкрэтны чалавечы характар, а хутчэй з'яўляецца адвольным ад заняга агульнай ідэйнай устаноўкі. Так, напрыклад, у вялікім вершы «Браты» паэт паставіў сабе задачай адлюстраваць дружбу народаў СССР. Для гэтай мэты ён малюе прадстаўнікоў чатырох народаў, якія расказваюць, кожны па парадку, аб шляху свайго народа. Пры гэтым кожны з чатырох «братоў» дадзены не як канкрэтная асоба з прыўласнымі ёй тымі ці іншымі чалавечымі якасцямі, а заведама абагульненым, г. зн. як повад для агульных выказванняў Броўкі. Пошукі паэтычнага абагульнення без дастатковага ўліку «прыватных» дэталяў, праз якія абагульненне павінна праявіцца, прывялі Броўку да верша плакатнага і недастаткова канкрэтнага. Ніякіх станоўчых рэзультатаў не дасягнуў Броўка, ужываючы паасобныя сродкі лакалізацыі дзеяння ў вершы «Браты». Адтаго, што «браты» сустракаюцца на шахце, «прайшоўшы забой», і размаўляюць, прысеўшы на камень, яны не становяцца больш жывымі, ці больш пераканаўчымі. Усё гэта — чысцейшая ўмоўнасць, паколькі ўсе «прыватнасці» тэмы падначалены занадта абстрактнаму замыслу паэта.

У вершы «Занга» Броўка расказаў аб сваім прабыванні ў Совецкай Арменіі:

Я Арменію бачыў усю,
і шчаслівы за наша спатканне.
Дя трыбуны сталіцы прайшоў
караванаў нязведаны рост...
Я паэмы народа пачуў,
я гасціў у Наіры Зар'яна.
Шум садоў вінаградных адтуль
да сябе на радзіму прынёс.

Варта параўнаць гэты верш з вершам «Браты», каб лішні раз пераканацца ў велізарнейшай перавазе канкрэтна-арганічнага аўладання палітычнай тэмай над тэзісападобным, па-заіндывідуальным падыходам да гэтай-жа тэмы. Шырокая тэма пролетарскага інтэрнацыяналізма ў вершы «Занга» («З армянскіх матываў») стала тэмай вершавай, г. зн. яна абрасла бытам, ператварылася ў лірычны сюжэт, падмацавалася вялікай колькасцю жыццёвых дэталяў.

Якасна новай з'явай у вершах Броўкі апошніх год з'яўляецца іменна гэтае ўменне карыстацца дэталлю. У адрозненне ад першых паэтычных зборнікаў Броўкі, «Вясна радзімы» змяшчае ў сабе, побач з вершамі аратарска-публіцыстычнымі, цэлы рад вершаў эпічнага складу, вершаў з поўнай тэндэнцыяй да бытавога альбо пейзажна-апісальнага элементу. Незаўсёды Броўка вызначаўся ўменнем бачыць, як «сом прачнуўся на зары і спудзіў шчупака», якімі фарбамі іграе пачатак восені... Ва ўзмоцненай прыхільнасці да бытавой альбо пейзажнай зарысоўкі, што ў вельмі вялікай ступені характарызуе паэзію Броўкі, сказваецца выразна новая, у параўнанні з яго раннімі вершамі, ідэйная якасць. Справа ў тым, што Броўка не толькі дэкламуе аб нашай рэчаіснасці. Ён глыбока аўладаў ёю і таму арыентуецца ў яе мясцовасцях, быццам ва ўласным абжытым доме.

У вершы «Палессе» Броўка заўважае:

Як плывуць на Тураў параходы,
Як лісты прывозіць самалёт
як «ад вады ўзняўся сіні дым». Ён чуе, як «кнігаўкі галёкаюць па лесе, дзятлы выбіваюць: дук-дук-ду...». Усё блізкае, зразумелае, даўно знаёмае. Дарэчы, у вершы «Палессе» Броўка з выключнай сілай намаляваў вобраз «апошняга чараўніка», што глядзіць на новае, пераўтворанае Палессе, глядзіць і не пазнае:

Хлопцы і дзяўчаты, песні, песні...
Неба выгінаецца, звініць.

«Палессе» з'яўляецца адным з лепшых вершаў П. Броўкі.

Блізка прымыкае да яго ў сэнсе багатай вобразнасці і ідэйнага гучання верш «Дзед Тарас», верш аб тым, як —

Да самае раніцы
Ленскі спяваў
Першы раз у жыцці
Ў хаціне Тараса.

Найбольшым выражэннем эпічна-апісальнай тэндэнцыі ў творчасці Броўкі з'явілася яго паэма «1914». У ёй даецца цэлы рад выразных рэалістычных карцін імперыялістычнай вайны. Успомнім сцэну адпраўкі нозабранцаў на фронт, калі:

Ладанкі з зямелькай
майстравалі маткі,
Торбы ў дарогу
ладзілі жанкі...,

альбо іранічнае, моцнае:

А пакуль Сымон
З жонкай ноч прагутарыў
Як адной дагледзіць
Галодныя раты,
Нейкаму сынку,
Недзе там, на хутары,
Сніліся пагоны
З прасветам залатым.

Успомнім страшную карціну «звароту героя», у якога «не хапала малага — толькі рук ды ног». Ва ўсіх гэтых сцэнах, як і ў цэлым радзе іншых, Броўка праявіў сябе паэтам, які востра і выразна адчувае партрэтна-чалавечы вобраз, які ведае сапраўдную цану канкрэтна-бытавому матэрыялу. У гэтых адносінах паэма «1914» прадастаўляла дастаткова сродкаў для далейшага ўзбагачэння паэтычнай мовы Броўкі, якому часам пагражае небяспека застыгнуць ці, што больш правільна, перайсці ў нейкі другі, застываючы, амаль алегарычны план нашага адчування. Растлумачым гэта прыкладамі з апошняй кнігі:

І ўжо сонца
рэспублікай смелае рушыць,
усё спявае кругом,
весяліцца адно...

Абстрактны зобраз Пасіянарыі ў вершы пад такой-жа назвай. Пасіянарыя ідзе —

Зноў у першыя рады
з адважнай, мудрай галавой,
чырвоны сцяг узнесла ўвысь
магутнымі рукамі.

У вершы «Мой таварыш» Броўка піша аб сваім пакаленні:

Гэта там юнацтва наша
Караблі свае спушчала
На прастор жыцця глыбокі,
Між начэй бурлівых, горных...

Выразна алегарычным з'яўляецца верш «На полі першая раса», дзе адцягненая, двухпланная семантыка яўна зніжае яго выразнасць.

На шчасце, шляхі броўкавай лірыкі праходзілі ў іншым напрамку. Гэтыя шляхі вызначаюцца такімі вершамі, як «Палессе», «Вечар», «Зямля», «З армянскіх матываў», «Канец лета» — вершамі, у якіх жывы голас паэта-грамадзяніна, у кожным паасобным сваім праяўленні, прабіваецца праз усе ўмоўнасці паэтычнай мовы, знішчаючы «нейтралізуючыя праклaдкі» паміж сабой і чытачом.

Гаворачы аб «нейтралізуючых праклaдках» (Асееў), нам хацелася-б адзначыць, апрача вышэйпаказанага бясплотнага вершавага слова, і бясконцае пералічэнне прыкмет і з'яў, розных па свайму значэнню і тэмпераменту, абязлічаных і абясцвечаных вершам:

Бліщчаць нагатове
рады батарэй,
парашутысты
скачуць ад зор,
кавалерысты
бяруць бар'ер,
танкісты
заводзяць магутны матор.

За падобным вершам немагчыма сачыць. У ім няма пазетра, хоць-бы ў параўнанні з такімі радкамі ў тэмпераментнай і яркай «Песні дзержынцаў»:

Дзержынцы,
Мы пільнасць ніколі не страцім,
Мы знаем задачу сваю —
За намі краіна — рэспубліка працы,
Вялікі Совецкі Саюз,
За намі
Палаюць крэмлёўскія зоры,
За намі сталіца Масква.
І рэкі як срэбра,
І люстра-вазёры,
І стэпаў густая трава.

Сярод лірычных вершаў Броўкі трэба вылучыць верш «Вечар» з такімі пасапраўднаму цёплымі радкамі аб каханай:

Як снапы мы з ёю там насілі...
Мне-ж адно спакою не дае —
Дзе якой зарою чырваніла
Яна вусны тонкія свае...

Пятрусь Броўка належыць да ліку нашых лепшых паэтаў, што паслядоўна працуюць над стварэннем палітычнай лірыкі. Ён павінен зразумець, што выкананне гэтай задачы залежыць не толькі ад правільнага выбару тэмы, але і ад умелага накіравання паэтычных сродкаў, якія далі-б найбольш поўнае і адэкватнае выражэнне гэтай тэме. На гэтым шляху напісаны лепшыя вершы Броўкі, якія па праву ўваходзяць у актыў беларускай совецкай лірыкі.

СУПРОЦЬ ФАРМАЛІЗМА Ў МАСТАЦТВЕ

ЛІКВІДАВАЦЬ РЭЦЭДЫВЫ ФАРМАЛІЗМА

Два дні (9 і 10 студзеня) калектыў работнікаў Белдзярждрамтэатра абмяркоўваў загад Усесаюзнага Камітэта па справах мастацтваў аб ліквідацыі тэатра імя Мейерхольда.

З уступным прамовай выступіў мастацкі кіраўнік Дзяржаўнага беларускага драматычнага тэатра тав. Рахленка. Ён доўга гаварыў аб прычынах ліквідацыі тэатра імя Мейерхольда, як тэатра абанкроціўшагася, і аб шкоднасці для совецкага тэатра мейерхольдаўшчыны. Толькі ў канцы сваёй прамовы тав. Рахленка ў некалькіх словах агульна спыніўся на фармалізме ў беларускіх тэатрах. Мы лічым, што з гэтага трэба было пачынаць. Не канстатаваць, а ўскрываць памылкі павінен быў бы тав. Рахленка.

Выступаючыя ў спрэчках тт. Е. Рамановіч, Глікман, Зораў, Краўцоў, Саннікаў недастаткова крытыкавалі мейерхольдаўскія памылкі рэжысёраў і фармалістычныя памылкі асобных актораў тэатра. Яны сканцэнтравалі сваю ўвагу выключна на памылках былога мастацкага кіраўніка тэатра тав. Літвінава, у практыцы якога назіраліся праявы мейерхольдаўшчыны — рэжысёрскае дыктатарства, зневажанне актора, трукацтва і іншыя фармалістычныя выверты.

Тт. Е. Рамановіч і Зораў адзначылі, што спектаклі «Недарасль» і «Скупы» маюць значныя фармалістычныя памылкі.

Работнікі тэатра выказалі незадавальненне, што першы дзень схода прайшоў на нізкім палітычным узроўні.

На сходзе 10 студзеня з крытыкай работы тэатра выступілі акторы Рамановіч, Ямпольскі, Бірыля, Ермоліна. Яны зусім правільна гаварылі, што кіраўніцтва тэатра адарвана ад калектыва, не лічыцца з думкамі актораў, не робіць абмеркавання новых работ, не прыслухоўваецца да сігналаў калектыва, які ўжо раней гаварыў аб фармалістычных памылках у спектаклях «Скупы» і «Салавей».

Тав. Літвінаў выступіў на сходзе з крытыкай уласных памылак. Аднак, ён неглыбока і павярхоўна ўскрыў прычыны мейерхольдаўшчыны, якія панавалі і пануюць у яго творчасці.

З беспрынцыпнымі прамовамі выступілі кіруючыя работнікі тэатра тт. Гайдарын і Рахленка. Замест таго, каб па-большэвіцку ўскрыць праявы фармалізма, якія мелі месца ў Белдзярждрамтэатры, і намеціць шляхі выкарчоўвання іх, яны заняліся агульнымі разважаннямі, беззадказна ахайваючы работу тэатра і тым самым уносячы блытаніну ў такое важнае пытанне, як абмеркаванне мейерхольдаўшчыны ў звязку з ліквідацыяй тэатра імя Мейерхольда.

Калектыў тэатра аднадушна вітае загад Камітэта па справах мастацтваў пры СНК СССР аб ліквідацыі тэатра імя Мейерхольда.

Трэба ўсё-ж адзначыць, што сход работнікаў Белдзярждрамтэатра не ўскрыў усіх фармалістычных памылак, якія маюць месца ў тэатры.

А. ЕСАКОЎ.

ЗА МАСТАЦТВА, ВАРТАЕ ЭПОХІ СОЦЫЯЛІЗМА

10 студзеня калектыў Дзяржаўнага дзіцячага тэатра БССР абмеркаваў загад Камітэта па справах мастацтваў пры СНК СССР аб ліквідацыі тэатра імя В. Мейерхольда.

Творчыя работнікі тэатра аднадушна віталі гэты загад, накіраваны супроць фармалізма і дзейнасці варожых агентаў на фронце мастацтва.

Выступаўшыя — засл. арт. БССР тав. Міровіч, рэжысёр тав. Палічынецкі, акторы тт. Фрыдман, Дашкоўскі, Стэльмах і інш. адзначылі факты варожай соцыялістычнаму мастацтву дзейнасці В. Мейерхольда ў тэатры, якім ён кіраваў, антысовецкую лінію работы тэатра імя В. Мейерхольда, што прывяло яго да поўнага ідэйнага і мастацкага краху.

Разам з гэтым выступаўшыя ўказалі на неабходнасць рашучай барацьбы з паслядоўнікамі Мейерхольда ў нас, з фармалістычным трукацтвам, якое і дагэтуль знаходзіць сабе месца на сцэнах тэатраў БССР. Тав. Палічынецкі прыводзіў, як прыклад, наскрозь фармалістычную пастаноўку п'есы Тірсо дэ Моліна «Дон Жуан», зробленую рэжысёрам Галаўчынерам (у ТРАМ'е).

Фармалісты, знаходзячы сабе прытулак у маладзёжным тэатры, надзвычай вялікую шкоду прынеслі маладым акторам.

Тав. Фрыдман указаў на тое, што кіраўніцтва тэатра недастаткова прыслухоўваецца да сігналаў творчых работнікаў — актораў — аб фармалістычных і іншых скажэннях у спектаклях і несвоечасова выпраўляе іх.

Асуджаючы фармалізм, дзейнасць тэатра імя В. Мейерхольда, рэжысёр Міровіч адзначыў і памылкі фармалістычнага парадку ў сваёй творчасці, перамаганне якіх дало магчымасць стварыць спектакль зразумелы і патрэбны нашаму гледачу.

Маладыя акторы Дзяржаўнага дзіцячага тэатра БССР правільна зразумелі ўсю шкоднасць фармалістычных і іншых ухілаў у мастацтве і ў прынятай пастанове абавязаліся актыўна змагацца за праўдзівае, шчырае — рэалістычнае мастацтва нашай эпохі — эпохі соцыялізма.

А. Б.

ТВОРЧЫЯ РАБОТНІКІ ТЭАТРА ВІТАЮЦЬ ЗАГАД КАМІТЭТА

9 студзеня творчы калектыў Дзяржаўнага рускага драматычнага тэатра БССР абмеркаваў загад Камітэта па справах мастацтваў пры СНК СССР.

Дырэктар тэатра тав. Бернардаў гаварыў аб палітычным значэнні загада Камітэта і неабходнасці рашучай выкарчоўкі фармалістычных элементаў у тэатры.

Аб поўным ідэйна-мастацкім краху тэатра Мейерхольда і шматгадовай шкодніцкай дзейнасці на тэатральным фронце Мейерхольда і яго падручных гаварыў мастацкі кіраўнік тэатра А. Данацi.

Артыстка Абуховіч выказала думку ўсяго калектыва, калі сказала, што загад Камітэта аб ліквідацыі тэатра Мейерхольда адпавядае думкам і жаданням кожнага сумленнага, любячага сваю радзіму творчага работніка.

Аб глыбока рэакцыйнай, антысовецкай сутнасці тэатральнай дзейнасці Мейерхольда гаварыў артыст Орлоў.

З цікавай прамовай выступіў старшыня мясцкома тэатра артыст Траянскі. Тав. Траянскі крытыкаваў кіраўніцтва тэатра за тое, што яно не падхапіла сігналаў газеты «Літаратура і мастацтва» аб наяўнасці элементаў фармалізма ў спектаклях тэатра. Ён указаў, што наскрозь фармалістычны спектакль «Жаніцьба Бальзамінава» яшчэ знаходзіцца ў рэпертуары тэатра. Тав. Траянскі правільна ўказаў таксама на тое, што ў добрым спектаклі «Як гартавалася сталь» мастацкае афармленне з'яўляецца фармалістычным, не адпавядаючым духу і атмасферы рамана Астроўскага.

Пра тое, як Мейерхольд і яго падручныя ў розных тэатрах Совецкага Саюза калечылі актораў, перашкаджаючы творчаму росту маладых кадраў, гаварылі артысты Палякоў, Вепрынскі і Барысевіч.

Н. С.

Змагацца за рэалістычнае мастацтва

Агульны сход работнікаў Дзяржаўнага рускага драматычнага тэатра БССР вітае загад Усесаюзнага Камітэта па справах мастацтваў аб ліквідацыі тэатра імя Мейерхольда. Загад паклаў канец дэзарганізатарскай дзейнасці Мейерхольда на фронце мастацтваў совецкай краіны.

Чужы совецкаму гледачу, совецкаму мастацтву, фармалістычны тэатр, скажаўшы п'есы класічных і совецкіх аўтараў, тэатр, які працягваў у рэпертуар п'есы, што паклёпнічалі на совецкую рэчаіснасць, ізаляваў сябе ад совецкай грамадскасці і стаў штандарам эстэтвуючых і неразброеных фармалістаў.

Мейерхольдаўшчына пусціла даволі глыбокія карэнні ў тэатральным мастацтве БССР. Вораг народа, які прапаваў у Дзяржаўным яўрэйскім тэатры БССР, узмоцнена насаджваў у тэатры варожую совецкаму мастацтву мейерхольдаўшчыну, спрабуючы пранікнуць праз сваіх падручных і ў іншыя тэатры Беларусі, заразіць іх фармалістычнай атрутай, адарваць мастацтва тэатра ад шырокіх народных мас, зрабіць яго здабыткам невялікай групы буржуазных эстэтвуючых фармалістаў. Ворагі народа, якія арудвалі на фронце мастацтва, і іх паслядоўцы выкрыты. Але элементы фармалізма і іншыя варожыя ўплывы ў мастацтве, прышчэпленыя імі, яшчэ не выкарчаваны да канца. Барацьба за сапраўды совецкі тэатр, за рэалістычнае мастацтва, як зброю ў барацьбе за ліквідацыю перажыткаў капіталізма ў эканоміцы і свядомасці людзей, ёсць таксама і барацьба за канчатковую ліквідацыю неразброіўшагася фармалізма і астаткаў яго ў нашых тэатрах, якая з'яўляецца бліжэйшай і важнейшай задачай усяго фронта мастацтваў.

Агульны сход пастанаўляе правесці на бліжэйшых вытворчых нарадах праверку рэпертуара Рускага тэатра БССР у святле рашэння Усесаюзнага Камітэта па справах мастацтваў аб ліквідацыі тэатра імя Мейерхольда.

Па даручэнню агульнага схода: ОРЛОЎ, ДАНАЦІ, БЕРНАРДАЎ, БАРЫСЕВІЧ.

Поспех фільма „Балтыйцы“

У 13 буйных кіно-тэатрах Масквы дэманструецца фільм «Балтыйцы» (вытворчасць Белдзяржкіно). Фільм карыстаецца вялікім поспехам у гледача. За 5 дзён 350 тысяч масквічоў прагледзелі гэты выдатны фільм.

А. МАІСЕЯЎ.

Совет Дома Кіно ад імя кінаработнікаў Масквы паслаў творчаму калектыву фільма «Балтыйцы» тэлеграму, вітаючы яго з вялікім творчым поспехам — стварэннем выдатнага фільма.

ГОЛЬДРЫНГ.

Народны артыст СССР

Л. ЛЕАНІДАЎ

СТАНІСЛАЎСКІ

Праз некалькі дзён мы адзначаем 75-годдзе Канстанціна Сяргеевіча Станіслаўскага. Слаўная дата! Слаўнае жыццё, аддадзенае служэнню мастацтва!

Пра гэтага чалавека цяжка пісаць успаміны. Успаміны — гэта апавяданне пра мінулае. А. Станіслаўскі — увесь у сучасным. І не толькі ў сучасным, але і ў будучым. Уплыў Станіслаўскага на тэатр не абмяжоўваецца нашай краінай — ён распаўсюджваецца на многія краіны свету.

Цяпер мне хочацца расказаць пра Канстанціна Сяргеевіча, як пра друга і настаўніка, якога я люблю і паважаю, у прысутнасці якога я адчуваю сябе маладым.

На перажытыя падзеі яшчэ не лёг попел часу. Яны яркія, як быццам адбыліся зусім нядаўна. Яны значныя не толькі для мяне і маіх таварышоў па тэатру, але і для таго пакалення актораў, якое толькі ўступае на шлях служэння совецкаму соцыялістычнаму мастацтву.

***

Позняя восень 1903 года. Я, актор тэатра Корша, прысутнічаю на спектаклі ў Мастацкім тэатры. Ідзе «Дзядзя Ваня». Гэты вечар назаўсёды застанецца ў маёй памяці. Я ўбачыў самога аўтара «Дзядзі Ванi», а ў антракце быў запрошан за кулісы і прадстаўлены Канстанціну Сяргеевічу, які сядзеў у грыме доктара Астрава.

Мы гутарылі ўвесь антракт. Канстанцін Сяргеевіч распытваў мяне пра тое, як я жыву, цікавіўся падрабязнасцямі маёй артыстычнай работы. Тады ўжо я адчуў усю сілу абаяння гэтага чалавека.

Другая сустрэча мела дзелавы характар. Мне прапанавалі перайсці ў Мастацкі тэатр. Я быў запрошаны да Канстанціна Сяргеевіча ў дом, пазнаёміўся з яго сям'ёй. Тэатр працаваў тады над п'есай «На дне».

— Вось рэпетыруем п'есу Горкага, — гаварыў Канстанцін Сяргеевіч. — Таленавітая п'еса! Але як і што атрымаецца, невядома. Ходзім на Хітрову рынку, назіраем...

Незадаволенасць дасягнутым, пошукі новага, больш дасканалага, заўсёды былі характэрнымі для Станіслаўскага. Гэтыя пошукі часамі заводзілі яго ў бок. Быў час, калі ён імкнуўся выходзіць ад вонкавага. Вывучаў выгляд таго альбо іншага персанажа, працаваў над яго вопраткай, паходкай, манерай сядзець, есці, глядзець. І толькі пасля гэтага пераходзіў да яго ўнутранага аблічча. Цяпер Канстанцін Сяргеевіч кажа:

— Покуль вы не схопіце зерне, покуль не дасягнулі ўнутранага зместу героя, вы не зможаце поўнасцю авалодаць роллю.

Заўсёды здзіўляла і здзіўляе мяне ў Канстанціне Сяргеевічу велізарная ўпартасць, з якой ён імкнецца адшліфоўваць кожную найдрабнейшую дэталь.

Памятаю, рэпетыравалі «Вішнёвы сад», і Канстанцін Сяргеевіч надумаўся ў другой дзеі душыць камароў.

Чэхаў кажа:

— Тут няма ніякіх камароў.

А Канстанцін Сяргеевіч адказвае:

— О, прырода дзіўная!

І — хлоп: злавіў уяўнага камара.


Чэхаву гэта не спадабалася. Спрачаліся, спрачаліся. Нарэшце, Канстанцін Сяргеевіч заяўляе:

— Дазвольце хоць аднаго камара.

Чэхаў, смяючыся, згадзіўся.

— Але затое, — жартаваў ён, — наступную п'есу я пачну так: «Добра, што тут няма камароў».

Ці яшчэ выпадак, які датычыць першай пастаноўкі «Рэвізора». Паяўляецца Хлестакоў, абкружаны чыноўнікамі, падвыпіўшымі за добрым абедам. Я іграў Ляпкіна-Цяпкіна. Канстанцін Сяргеевіч кажа мне:



К. С. Станіслаўскі ў 1900 годзе.

— Выходзьце на сцэну і вы.

— Не магу.

— Без усякіх размоў, выходзьце на сцэну, — паўтарае Станіслаўскі. — Нічога не жадаю чуць. Выходзьце.

Прыйшлося выйсці.

Па Гогалю Ляпкін-Цяпкін не павінен быў у гэты момант знаходзіцца на сцэне. Але Канстанціну Сяргеевічу так хацелася запоўніць сцэну, што ён забыўся пра Гогаля. Ён тады нават «паправіў» Гогаля і сказаў:

— Тут у Гогаля памылка.

Калі Канстанцін Сяргеевіч працаваў, з боку, ды яшчэ староннявму чалавеку, ён мог здавацца проста апантаным.

1905 год. Трывожныя дні забастоўкі. На Тверской страляніна. Мы рэпетыруем «Гора ад вума». Канстанціну Сяргеевічу паведамляюць аб тым, што твэрыцца на вуліцы. Ён адказвае:

— Адну хвіліначчу, зараз скончым.

Стрэлы набліжаюцца. Яны чутны ўжо ў Камергерскім завулку. З вокнаў тэатра мне відны прыставы і паліцэйскія, якія страляюць з рэвальвераў. Пра гэта гавораць Станіслаўскаму.

— Зараз, зараз скончым. Яшчэ адзін сказ.

А пасля рэпетыцыі яму і групе актораў толькі з цяжкасцямі ўдалося дабрацца да дома.

Пры ўсёй сваёй настойлівасці, пры ўсёй упартасці Канстанцін Сяргеевіч вельмі ўважлівы да таго, што яму гавораць. Калі спектакль зроблены, ён ідзе на суд таварышоў альбо аўтарытэтных людзей, і Станіслаўскі ўважліва выслухоўвае ўсе заўвагі.

Таленавітасць спалучаецца ў Станіслаўскага з выключнай працаздольнасцю. Глядач бачыць спектакль, як нешта цэлае, маналітнае. Для рэжысёра-ж і актора спектакль — гэта тысячы найдрабнейшых падрабязнасцей, якія трэба прадумаць, прапрацаваць, злучыць і пераплавіць у горне творчасці.

Канстанцін Сяргеевіч не перастае напамінаць, што ў мастацтве нішто лёгка не даецца. Мне здаецца, што Станіслаўскі — гэта Моцарт, які хоча злучыць у сабе і якасці Сальеры. Ён глыбока перажывае поспехі і няўдачы сваёй работы. Але ніколі ён не імкнецца да асабістага поспеху, не праследуе асабістых мэтаў.

Добра сыграная роля, добра пастаўлены спектакль штурхаюць Станіслаўскага на новыя пошукі, да далейшай работы і ўдасканалення. Ролю ён прапрацоўвае ў найдрабнейшых дэталях. Над спектаклем працуе глыбока і ўпарта. Але гэта чалавек вялікіх гарызонтаў: па адной ролі, па аднаму спектаклю яму відзён лёс мастацтва. Ён ведае, для каго і для чаго ён творыць.

Багата выдатных актораў бачыў я. Але калі-б мяне спыталі: хто і ў якой ролі зрабіў на мяне найбольш моцнае ўражанне, я, не задумваючыся, адказаў бы: Станіслаўскі ў ролі Штокмана з п'есы Ібсена «Доктар Штокман». Яго гарнітур, грым, рухі, перажыванні, — усё было дасканалым. Пачуццё глыбокай, безвыходнай адзіноты ішло ад яго і распаўсюджвалася на ўсю залу.

Вобразы, створаныя акторам Станіслаўскім, закончаныя, быццам літыя. Ён асуджае актораў, якія то даходзілі пры выкананні да геніяльных вышынь, то «мазалі», даючы пустыя месцы. Канстанцін Сяргеевіч вучыць, што зроблены аднойчы малюнак ролі змяняць нельга. Уся лінія так званага «скразнога дзеяння» павінна быць даведзена да канца. Але актору прадастаўляецца творчая свабода змяняць псіхалагічныя інтанацыі.

Акрамя работы над роллю, Канстанцін Сяргеевіч патрабуе ад актора работы над сабою, бесперапыннага ўдасканальвання. Памятаю такі выпадак. Працавалі, рэпетыравалі. Канстанціну Сяргеевічу здавалася, што ніяк акторы не могуць вызваліцца ад пачуцця скаванасці.

— Пакажыце сваю фантазію і смеласць, — сказаў ён. — Зрабіце што-небудзь незвычайнае, што справы не датычыць.

І раптам мы бачым: адзін з актораў, падыходзіць да Станіслаўскага і пачынае развязваць у яго гальштук.

Трэба было бачыць шчаслівы твар Канстанціна Сяргеевіча.

І можа здацца дзіўным, але іменна з гэтага часу мы пачалі рэпетыраваць з натхненнем.

Абаянне, харэство ўнутранае і вонкавае спалучаюцца ў гэтым чалавеку. У Амерыцы мы ігралі «Цара Фёдара Іоанавіча». Спектакль заканчваўся. Публіка выклікала рэжысёра. На паперці Успенскага сабора, дзе толькі-што знаходзіліся баяры, стральцы, паяўляецца прыгожая, велічная постаць Станіслаўскага. Як грымелі апладысменты!

У мінулым годзе я правёў з Канстанцінам Сяргеевічам месяц у санаторыі. Ён быў нездаровы, але, не гледзячы на хваробу, прагнуў сустрэч і з велізарнай цікавасцю слухаў усіх, прыходзіўшых да яго. «Праўду» і «Известия» ён чытаў штодзённа ад пачатку да канца. Ён за ўсім сочыць і заўсёды з гордасцю гаворыць аб сваёй радзіме. Ён горача абараняе думку, што толькі ў нашай краіне можа быць сапраўднае мастацтва.

Вольны час ён прысвячаў рабоце над сваёй кнігай.

Хвароба аддаліла Канстанціна Сяргеевіча ад непасрэднай практычнай дзейнасці ў тэатры. Але ён працягвае быць у курсе ўсяго, усё ведае. Маладыя, прышоўшыя нядаўна акторы, як і ўвесь калектыў працягваюць адчуваць кіраўніцтва гэтага выдатнага майстра. Памятаю, з якой радасцю аўтар «Зямлі» Н. Вірта паведаміў мне, што ён атрымаў тэлеграму, у якой Канстанцін Сяргеевіч станоўча выказваецца аб гэтай п'есе.

Станіслаўскі часта паўтарае словы Шчэпкіна, які пісаў свайму вучню Шумскаму: «Ты сёння можаш іграць горш, заўтра лепш, але ты заўсёды павінен іграць правільна».

Да гэтай правільнасці, да мастацкай праўды заўсёды імкнецца Канстанцін Сяргеевіч. І гэтаму вучацца і будуць вучыцца ў яго цэлыя пакаленні актораў.

ВЫНІКІ УСЕСАЮЗНАГА КОНКУРСА ПІЯНІСТАЎ

Першая прэмія прысуджана І. І. МІХНОЎСКАМУ

У Маскве закончыўся першы Усесаюзны конкурс піяністаў, арганізаваны Усесаюзным Камітэтам па справах мастацтваў. Першую прэмію — 10 тысяч рублёў журы прысудзіла піяністу І. І. Міхноўскаму (Масква). Другая і трэцяя, чацвертая і пятая прэміі рашэннем журы аб'яднаны ў дзве другіх і дзве трэціх прэміі. Дзве другіх прэміі—па 8 тысяч рублёў — прысуджаны піяністам А. Л. Каплану (Масква) і В. В. Нільсену (Ленінград), дзве трэціх—па 6 тысяч рублёў— А. Е. Геронімусу (Ленінград) і А. Г. Татуляну (Масква). Шостую прэмію—3 тысячы рублёў атрымаў Б. А. Склоўскі (Харкаў), сёмую — 3 тысячы рублёў — піяністка І. О. Гольдфарб (Одэса), восьмая, дзевятая і дзесятая прэміі—па 2 тысячы рублёў — падзелены паміж В. Е. Кіппа (Кіеў), М. В. Поляк (Масква) і Л. В. Шур (Кіеў).

За лепшае выкананне твораў совецкіх кампазітараў спецыяльныя прэміі атрымалі Л. Д. Грынберг (Менск), А. К. Клумаў (Менск), Н. М. Мусінян (Масква) і М. Е. Шыфман (Масква). Прэміі за лепшае выкананне твораў Бетховена атрымалі С. І. Берман (Масква), Б. С. Маранц (Свердлоўск), М. В. Мільман (Масква) і М. Е. Шыфман.

Адзначаючы агульны высокі ўзровень удзельнікаў конкурса, журы пастанавіла выдаць 15 ганаровых дыпломаў.

ЛАЎРЭАТЫ

Усесаюзны конкурс піяністаў прынёс мне вялікае задавальненне. Майму вучню, 23-гадоваму Ісаку Міхноўскаму, прысуджана першая прэмія. На папярэднім конкурсе піяністаў першую прэмію атрымаў мой вучань піяніст-ордэнаносец Якаў Фліэр. Новы лаўрэат уваходзіць у дружную сям'ю лепшых піяністаў краіны, як агульнапрызнаны майстар.

У маім класе Міхноўскі займаецца шосты год—з 17-гадовага ўзросту. У 1935 годзе ён бліскуча скончыў Маскоўскую Кансерваторыю, у гэтым годзе канчае Вышэйшую школу мастацкага майстэрства.

Ісак Міхноўскі вельмі таленавіты і культурны піяніст. Ён адносіцца да ліку тых выканаўцаў, для якіх мастацкія задачы стаяць на першым плане. Зараз малады піяніст знаходзіцца, на маю думку, у стадыі росквіту свайго даравання і ў будучым пакажа яшчэ больш высокі клас майстэрства і дасканаласці.

К. Н. ІГУМНАЎ.
Прафесар-ордэнаносец.

***

Уладзіміра Нільсена я ведаю не першы год. Неаднаразова чуў яго і кожны раз з задавальненнем канстатаваў бурны рост майстэрства гэтага выключна таленавітага піяніста. Можа быць, ён уступае, як віртуоз, іншым піяністам, але затое ён на-галаву вышэй многіх, як музыкант, як арыгінальны выканаўца твораў Бетховена, Шумана, Шапэна. Выключнае гукавое майстэрства, яркія і сакавітыя гукавыя фарбы, якія піяніст знаходзіць, выконваючы рамантыкаў, надаюць яго ігры асаблівую чароўнасць.

Якаў ЗАК.
Лаўрэат міжнароднага шапэнаўскага конкурса, піяніст-ордэнаносец.
Масква.



Лаўрэат першага Усесаюзнага конкурса піяністаў І. І. МІХНОЎСКІ, які атрымаў першую прэмію. (СФ.)

КАНЦЭРТ ЧАЙКОЎСКАГА Ў БЕЛДЗЯРЖФІЛАРМОНІІ

За апошні час на афішах філармоніі ўсё радзей і радзей можна ўбачыць імёны класікаў сімфанічнай літаратуры. Тым больш здзіўляе тое, што філармонія вырашыла паказаць Чайкоўскага з Пятай сімфоніі і з уверцюры да «Рамео і Джульеты» — твораў, якія ўжо неаднаразова выконваліся ў Менску. Відома, трэба было-б пачаць паказ Чайкоўскага з менш вядомых і папулярных твораў, напрыклад з першай, другой і трэцяй сімфоній, з першай і другой сюіты, з уверцюры да «Гамлета», з музыкі да п'ес А. Астроўскага «Снягурачка» ці «Граза» і г. д.

Гаворачы аб самім канцэрце, трэба перш за ўсё адзначыць, што нармальнай гучнасці аркестра перашкаджае акустычна непрыстасаваная эстрада клуба імя Сталіна. Неабходна неадкладна стварыць умовы для нармальнага гучання аркестра.

Пятая сімфонія напісана Чайкоўскім у 1888 годзе, з хуткасцю, рэдкай нават для яе аўтара: да вясны (сакавік—красавік) адносяцца першыя замыслы сімфоніі. У пачатку чэрвеня кампазітар шчыльна прыступіў да яе напісання, у канцы чэрвеня сімфонія ў чарнавіку закончана, а палове жніўня канчаткова адцзелана і інструментавана. Характэрнай рысай сімфоніі з'яўляецца яе маналітнасць: праз усе часткі яе цэнтральнай, аб'ядноўваючай тэмай праходзіць тэма фатума, лёсу.

Выкананне сімфоніі пад кіраўніцтвам дырыжора І. А. Мусіна было праведзена ў добрых традыцыях адчування цэласнасці формы, ускрыцця канфліктнасці і асабістай трагедыйнасці яе зместу,—вельмі востра і эмацыянальна.

Недахопамі аркестра з'яўляюцца адсутнасць дакладнага строя і некалькі рэзкая, грубаватая гучнасць. Гэтыя недахопы адчуваліся і ў выкананні ўверцюры да «Рамео і Джульеты».

Арт. А. Н. Амітон, які выканаў першую частку канцэрта Чайкоўскага, артыст вялікай культуры і музыкальнай інтуіцыі. Усё-ж Амітону творча бліжэй дробная форма. Аб гэтым пераканаўча гавораць выкананыя ім на канцэрце п'есы «Рандзіна» Бетховена і «Славянскі танец» Дворжака-Крэйслера. У гэтых рэчах Амітон паказаў сябе вялікім мастаком, майстрам мініятур.

У заключэнне хочацца пажадаць аркестру вялікай і сур'ёзнай работы над павышэннем якасці гучання, а галоўнае—над удасканаленнем строя, а дырэкцыі філармоніі—найхутчэй рэканструіраваць эстраду клуба імя Сталіна.

А. ОСІПАЎ.

Выпуск драматычнай студыі

7 студзеня грамадскасць Менска праглядзела выпускны спектакль студыі Дзяржаўнага беларускага драматычнага тэатра — «Слуга двух паноў».

Неўміручая камедыя К. Гальдоні была выканана маладымі студыйцамі з вялікім пачуццём і шчырасцю, сустрэла выключна добры прыём у гледача.

Вячэрняя студыя Белдзяржрамтэатра была адкрыта 15 лістапада 1934 года. У студыю прышлі людзі розных прафесій, з розным жыццёвым вопытам і культурай. Інжынер, эканаміст-планавік, рабочы, кастэлянша і вучаніца апошняга класа сярэдняй школы — вось склад студыйцаў.

Улічваючы розны ўзровень падрыхтоўкі студыйцаў, кіраўніцтва студыі вырашыла ўвесці рад агульнаадукацыйных дысцыплін: агульную гісторыю, беларускую мову, гісторыю партыі, літаратуру. Асноўная ўвага, зразумела, была аддадзена спецыяльным прадметам: сцэнічнаму майстэрству, тэхніцы мовы, мастацкаму чытанню, пастаноўцы голаса, гісторыі тэатра і інш.

Упраўленне па справах мастацтваў, адпусціўшы на студыю пэўную суму грошай, палічыла сваю місію на гэтым скончанай і ўжо самой студыі прышлося клапаціцца аб забеспячэнні сябе выкладчыкамі. Актрыса Белдзяржрамтэатра тав. Галіна добра справілася з выкладаннем гісторыі тэатра і рэжысурай выпускнога спектакля.

Але самым цяжкім для студыі было перамаганне няўважлівых адносін да яе некаторых працаўнікоў тэатра і былога кіраўніцтва Упраўлення па справах мастацтваў. Работу студыі зрывалі сядзеўшыя ў Упраўленні ворагі народа, якія рабілі стаўку на развал і дыскрэдытацыю падрыхтоўкі тэатральных кадраў у БССР.

Але студыйцы здолелі перамагчы цяжкасці, паспяхова працавалі і стварылі цікавы выпускны спектакль.

Е. РАМАНОВІЧ.


Фота-хроніка



Дзяржаўны яўрэйскі тэатр у Маскве рыхтуе новую пастаноўку «Бар-Кохба». НА ЗДЫМКУ: макет другой карціны п'есы «Бар-Кохба». («Лес»). (СФ).



Студыя «Мосфільм» у хуткім часе выпускае фільм «Волга—Волга» ў пастаноўцы рэжысёра-ордэнаносца Александрава. НА ЗДЫМКУ: кадр з фільма «Волга—Волга» — арт. П. Оленеў у ролі вадавоза.



Нядаўна споўнілася стагоддзе бібліятэкі імя А. І. Герцэна ў гор. Кіраве.
НА ЗДЫМКУ: будынак герцэнаўскай бібліятэкі. (СФ)



Другая абласная алімпіяда мастацкай самадзейнасці ў Ленінградзе. НА ЗДЫМКУ: юныя ўдзельнікі самадзейнага аркестра народных інструментаў керамічнага завода ў Баравічах. (СФ).

НЕКРАСАЎСКІ ГАРАДСКІ ВЕЧАР

11 студзеня ў памяшканні клуба імя Сталіна (Менск) адбыўся гарадскі вечар, прысвечаны памяці вялікага рускага народнага паэта Н. А. Некрасава.

Вечар адкрыў уступным словам народны паэт Якуб Колас. Ён заклікаў беларускіх пісьменнікаў вучыцца праўдзівасці і высокай мастацкасці ў Н. А. Некрасава.

З вялікім дакладам аб жыцці і творчасці Н. А. Некрасава выступіў акад. І. І. Замоцін. Ён падрабязна расказаў аб жыццёвым шляху вялікага паэта і яго выдатных, бессмяротных творах.

Пасля даклада паэты прачыталі творы Н. А. Некрасава ў перакладзе на беларускую і яўрэйскую мовы: К. Крапіва прачытаў верш «Забытая вёска», А. Гурло—«Радзіма», З. Аксельрод—«Жалезная дарога», Э. Агняцвет — «Арына маці салдацкая», А. Якімовіч—урывак паэмы «Генерал Таптыгін», А. Астрэйка і М. Калачынскі—урыўкі з паэмы «Каму на Русі жыць добра».

І. К.

Адказны рэдактар І. ГУРСКІ.

Друкарня газеты «Звязда». Газета «Літаратура і Мастацтва» выходзіць раз у пяцідзён ку. Адрас рэдакцыі: Менск, Совецкая 68, тэл. сакр. 25-394, рэдактара 20-831. Уп. Галоўлітбела № 4057.